ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 38-ы
№ 87 (2447)
4 лістапада 1969 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Плакат Л. ЗАМАХА.

У ЧЫРВАНІ СЦЯГОЎ

ПРАДЧУВАННЕ гэтага свята ў кожнага з нас натуральнае і хвалюючае. Падпаліць восень лісце, пагоніць па блакіту хмары — ведаем: хутка надыдуць дні лістападаўскія. Нават малыя, і тыя рыхтуюцца сустрэць іх добрымі справамі— новай песенькай ці высокай адзнакай у дзённіку. І гэта ідзе, нібы эстафета, ад пакалення да пакалення. Хай малы прынясе ў школьным сшытку пяцёрку, юнак здабудзе спартыўны рэкорд, студэнт адкрые нешта ў складаным свеце навукі, будаўнік здасць яшчэ адзін будынак, у шкляныя вокны якога ўдарыць па-лістападаўску раптоўнае сонца, чыгуначнік па «зялёнай вуліцы» правядзе цягнік, на платформах якіх будуць павайсковаму строга рухацца да мэты працавітыя трактары... Пісьменнік і артыст, мастак і кампазітар, бібліятэкар і кінамеханік, супрацоўнік музея і кінадзеяч — кожны работнік культурнага фронту адзначае чырвоныя старонкі календара таксама справамі. Справы гэтыя і яны самі і наша грамадскасць вымяраюць высокімі крытэрыямі. Партыйнасць і народнасць, грамадзянскі пафас і вялікая праўда, разуменне законаў развіцця грамадства і адчуванне мэтазгоднай формы — вось дух і літара творчых шуканняў сапраўднага мастака ў краіне перамогшага Кастрычніка.

Творцы кіруюцца прынцыпамі марксісцка-ленінскай эстэтыкі.

І, набліжаючыся да знамянальнай даты—да 52-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі,— яны аглядаюць пройдзены літаратурай і мастацтвам шлях з пачуццём гордасці. Вялікі плён і здабытак народнай культуры—створаныя імі кнігі і карціны, музычныя і архітэктурныя творы, тэатральныя спектаклі і кінафільмы. Назапашаны каштоўны вопыт, які вучыць, што поспех дасягаецца адданасцю мастака высокім прынцыпам. Пачынаючы з тых векапомных дзён лістапада 1917 года, мастацтва лічыла і лічыць сябе закліканым і мабілізаваным у шэрагі рэвалюцыі, на службу яе ідэалам, генеральна вызначаным Уладзімірам Ільічом Леніным.

Праз якіх шэсць месяцаў чалавецтва будзе адзначаць дзень нараджэння чалавека, чыя думка і воля, авалодаўшы масамі працоўных, зрабілі цяперашняе стагоддзе векам сацыялістычнай рэвалюцыі і перамянілі грамадскі клімат планеты. Краіна — на працоўнай вахце. З высокім пачуццём адказнасці перад Леніным пачынаем мы кожны працоўны дзень — і кладуцца на палатно новыя фарбы, бягуць па паперы шчасліва адшуканыя ў душы радкі, з ватмана на плошчу пераходзіць смелы праект, здымаюцца кадры новага фільма... Творчы энтузіязм і мастацкі ўздым, з якімі цяпер узважваюць і ажыццяўляюць свае задумы пісьменнікі і мастакі, майстры сцэны і дойліды, грунтуецца на тым вопыце, што стаў скарбніцай нашай культуры за пяцьдзесят два гады Савецкай дзяржавы.

Мітынгі вялікай рэвалюцыі рэхам адбіваюцца ў творах, прысвечаных гераічна-рамантычнаму часу лістападаўскіх штурмаў і нашаму сённяшняму дню.

Ёсць у Пімена Панчанкі верш «Асцерагайцеся падробкі», дзе паэт з пазіцый заклапочанага ўзроўнем сучаснага мастацтва партыйнага мастака заклікае нас рашуча адмятаць з творчасці халтуру і прыстасаванцтва. Літаратурная і мастацкая грамадскасць прымаюць усе захады, каб перакрыць шлях спекуляцыі на важных тэмах. Калектыўны клопат пра дастойную сустрэчу юбілею павінен даць добры плён.

Адзін з Заклікаў Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза асабліва актуальны для работнікаў ідэалагічнага фронту — «ДЗЕЯЧЫ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА, РАБОТНІКІ КУЛЬТУРЫ! ВЫСОКА НЯСІЦЕ СЦЯГ ПАРТЫЙНАСЦІ САВЕЦКАГА МАСТАЦТВА, АДДАВАЙЦЕ ЎСЕ СІЛЫ І ЗДОЛЬНАСЦІ ВЫХАВАННЮ БУДАЎНІКОЎ КАМУНІЗМА!»

Час вымагае ад кожнага з нас помніць, што ў працэсе выхавання чалавека на станаўленне яго светапогляду ўплываюць і слова паэта, і песня, і фільм, і архітэктурны выгляд вуліцы. І нельга даваць сабе палёгкі, калі адрасуеш твор сучаснаму савецкаму слухачу і гледачу,— чалавеку, які кіруецца вельмі высокімі меркамі ў падыходзе да навінак літаратуры і мастацтва.

Як наказ на будучае ўспамінаем мы цяпер словы Уладзіміра Ільіча Леніна, з якімі ён звяртаўся паўстагоддзя назад да першамайскіх дэманстрантаў на Краснай плошчы: «Да гэтага часу, як аб казцы, гаварылі аб тым, што ўбачаць дзеці нашы, але цяпер, таварышы, вы ясна бачыце, што закладзены намі будынак сацыялістычнага грамадства—не утопія. Яшчэ больш старанна будуць будаваць гэты будынак нашы дзеці». Варта асабліва падкрэсліць менавіта гэта—старанна. Так, мы разумеем, што Радзіма і Партыя чакаюць ад нас добрасумленнай і стараннай працы на кожным участку ідэалагічнага фронту.

Праз тры дні працоўныя краіны будуць дэманстраваць сваю братнюю еднасць і гарачую адданасць ленінскім ідэям. Сярод святочных рапартаў аб перамогах будуць і рапарты работнікаў культуры, дзеячоў літаратуры і мастацтва. Адзначаючы тое, што намі зроблена, мы дадзім урачыстае абяцанне не спыняцца на дасягнутым і старанна ўдасканальваць майстэрства, каб ідэйна-мастацкі ўзровень нашых твораў быў варты свайго часу і народу, каб яны выконвалі высакародную місію па выхаванні будаўнікоў камунізма.

Лістапад ідзе па зямлі... Палошчуць на ветры разгорнутыя чырвоныя сцягі — сцягі барацьбы за Мір, Працу, Свабоду, Роўнасць, Братэрства і Шчасце ўсіх народаў.

НЯХАЙ ЖЫВЕ КАМУНІЗМ — СВЕТЛАЯ БУДУЧЫНЯ ЎСЯГО ЧАЛАВЕЦТВА!

Паэтычная ПАВЕРКА

Уладзіслаў НЯДЗВЕДСКІ

ЛЕНІНСКІМ ІМЕМ

Ён быў чалавек, барацьбой перапоўнены,
Мільёны за ім у змаганне пайшлі,
Таму што ён першы ў рукі працоўныя
Аддаў назаўжды лёс пакутнай зямлі.

Ён людзей заклікаў да ўсяго чалавечага,
І яго не забудуць ні людзі, ні час.
Сёння ў справах імкненні яго ўвекавечаны,
Сёння ў сэрцах ягоныя думкі ў нас.

І калі капітал знікне ў часе задымленым
І сатруцца граніцы, і знікне прыгнёт—
Тады неўміручым ленінскім іменем
Планету-зямлю называцьме народ.

РАБОЧЫ

Заўсёды ў дзень урачыстага свята
У людзей і ў планеты усёй на віду
Я з ім побач, як з бацькам і братам
У віры дэманстрацый іду.

І заўжды, калі грымнуць аркестраў гукі
Так, што меднае рэха запоўніць прасцяг.
Я гляджу на яго вузлаватыя рукі,
Якімі чырвоны ўзносіць ён сцяг.

Я гляджу яму ў твар, і рашучасці выраз
Мне нагадвае твары усіх тых людзей,
Між якімі у цэху заводскім ён вырас,
Між якімі пад ленінскім сцягам ідзе.

Я лаўлю яго позірк, а ягоныя вочы
Пазіраюць з-пад сцяга ў бязмежную даль,
Дзе на ўсіх паралелях рукамі рабочых
Свабода і дружба куюцца, як сталь.

Сцяганосец ідзе. Чутны мне яго крокі,
Што у свята пад музыку міру гучаць.
Паднімае свой сцяг ён да самых аблокаў,
Каб народам зямлі быў здалёку-здалёку
Бачны на сцягу партрэт Ільіча.

ПЕСНІ БЯРЫЦЕ З САБОЮ

ПОЗНІМ вечарам на кватэры Сямёна Пацёмкіна — паэта і журналіста, які жыве любоўю да роднага слова і народнай песні, — мы слухалі магнітафонны запіс. Моцны асенні вецер абіваў с таполяў лісце, а тут, у пакоі, сярод рукапісаў, кніг, магнітафонаў гучалі прыпеўкі, вершы, песні далёкага жыцця: са сваім словам, водарам, мелодыяй. І сярод іх, гэтых песень, такая:

Гэ-эй, дубе мой, дубе,
Дубочак зеляненькі
Лістом прыўкрашан.
Панічочак маладзенькі
Словамі прыяцен.
Словы твае прыемныя,
Усё — чортава думка.
Калі б цябе не любіла,
Была б я галубка.
Як шызая галубачка,
Паляцела б я к мору.
На ляту б гаварыла:
Ой, гора мне, гора.
Затапіла галовачку
На дно сіня мора.
Беднай маёй галовачцы
З мора не ўзнырацi.
Беднай маёй галовачцы
За панам не бываці.

Жаночы голас цёк спакойна, шырока, што рака на вясновым разліве — шукаючы новыя берагі, і адным з гэтых берагоў быў наш цёплы пакой, нашы думкі пра век песні, яе жывучасць, пра галовачку, якой «з мора не ўзнырацi», пра «дубочак зеляненькі»...

А назаўтра дубочкі мільгацелі за вокнамі газіка, адно ўжо не зялёныя, як у тае песні, а зжаўцелыя, афарбаваныя ў золата. З дубамі побач, пераможна, не прызнаючы нічыёй улады, зелянелі елкі, апошнімі лісцікамі пунсавелі бярозкі, даспелым жаўталесам дыхала абапал дарогі зямля, берагі Бесядзі і сама вада Бесядзі, за якой, адразу на ўзгорку, стаялі Бялынкавічы.

Спялёнутая вясёлымі фарбамі лістапада і разам з тым шчымліва-прыціхлым настроем, напоеная водарам разараных бульбяных палеткаў, убраных садоў і гародаў, вёска аказалася амаль бязлюднай. Ніну Бялугіну не знайшлі ні ў школе, дзе яна выкладае беларускую літаратуру, ні дома.

— У атаву пайшла, мабыць, — падказала суседка. — Цяпер усе або на бульбе, або на атаве.

Паўз платы па вёсцы сапраўды вылежвалася мокрая трава. Сакратар партыйнай арганізацыі мясцовага саўгаса «40 гадоў Кастрычніка» Фядот Андрэевіч Каральковў расказаў, якое было лета ў гэтых мясцінах. Лугі заліло вадою, яна не сышла да саменькай восені і цяпер касілі па вадзе, у гумовых ботах, ношкамі выносілі траву на сухое, рассцілалі пад сонцам паўз вуліцы, агарожы, у садах...

Усё ж надышоў адвячорак, калі разам з Нінай Сямёнаўнай мы пераступілі парог Хведара Дзмітрыевіча Іванова, дзядзькі Бялугінай, і тут ужо ўсе яе песні былі з намі, ды не адны песні, але і ўспаміны пра жыццё, што сплялося з песнямі неадрыўна, быццам карані дрэва з зямлёю.

— Праспяваю песні маёй бабкі. І прабабчыны. А вы паслухайце, — адразу прапанавала настаўніца. — Бабку маю звалі Агаф'я Міхайлаўна Зубоўская, пазней — Ніжнікава. Сама яна з хутара Дзераўца, а жыла ў Калодліве, вельмі песеннай вёсачцы. Прыгожая была ў маладосці. І ўсё спявала. За ўсіх. Хата стаяла на самым краі Калодліва, і як ідзе які новы чалавек цераз вёску — да бабкі. Вады папіць, чарку ўзяць. Калі хто пытаўся пра начлег, дык кожнаму яе хату паказвалі. Бабку маю ўсе кругом ведалі за прыгажосць, за песні, гасціннасць. Была ў яе такая песня...

Ніна Сямёнаўна вальней адпускае на шыі вузельчык квяцістай хусткі, складае на грудзях рукі, задумваецца, моўчкі глядзіць міма нас у акно, за каторым палымнее такой жа чырванню, што і хустка, рабіна. Спяваць яна пачынае спакваля, як за бяседным сталом, і не цяжка здагадацца, што спявае ў манеры сваёй бабкі Агаф'і Міхайлаўны: «Вы павейце, ветры, вы павейце буйны з зялёнага краю. Вы нясіце, ветры, вы нясіце буйны майму бацьку весці, а матцы жалосці, што з сваім старым я жыву не ў любосці. Праміж нас дзіцятка, праміж нас малое ўсю ночку крычала, вадзіцы бажала. Свякрова слыхала, не дала вадзіцы жаждаму дзіцяці...»

Зноў ціха. Апусціўшы галаў, у стол глядзіць Хведар Дзмітрыевіч, прыгадваючы сваё — яшчэ больш далёкае і ўжо няпэўнае. Не зводзіць вачэй з чырвані за акном Ніна Сямёнаўна. Адтуль, з-за акна, чуваць нуднае рыпенне нязмазаных колаў і тут жа — вые матор машыны. Таксама кантрасты. І ў наш дзень. Як у песнях.

— Усё з сенакосу едуць...

— А ў вайну жыла я з бабкай. Толькі не памятаю, каб яна тады спявала. Маці маю немцы ў Германію пагналі. Бацькі не было. З бабкай і ў лес, і ў луг. Пасля вайны адразу таксама бедавалі, не было што есці. Збіраем, бывала, з ёю пучча са шчаўя на хлеб, а яна і спявае. Аб долі жаночай. Пра хлопцаў маладых, што з вайны не вярнуліся. Пра сіраціну Ганначку. Такая песня «Пасылаюць Ганначку скрозь ноч па ваду». Мачаха пасылае. І ўвязваюцца за Ганначкай ваўкі. Ноч цёмная, хоць вока выкалі. Схапілі ваўкі Ганначку — каму ручанька, каму ножанька.

Думала Ганна, што вятры гудуць,
Ажно за ёю ваўкі ідуць —

заканчвае паўторам Ніна Сямёнаўна.

І зноў расказвае. Тым жа напеўным голасам. Расказвае — як спявае. Спявае — як расказвае.

— У нашай хаце яшчэ чатыры дзядзькі жылі. Усе спявалі. Дзядзька Мансім іграў на скрыпцы, на мандаліне. І бабка на скрыпцы іграла. Але песні свае яна адным голасам вяла, без музыкі. Дзевяноста тры гады пражыла.

— Ды і прабабка твая спявуха была о-го! Сто тры гады жыла, увесь век спявала, — устаўляе Хведар Дзмітрыевіч.

— Прабабку памятаю мала, — кажа Ніна Сямёнаўна. — А з бабкай пад песні колькі разоў хадзілі з Дзераўца ў Калодліва. Праз Панкі, Вялікі Бор, Дубраўку. Кіламетраў семнаццаць. Ідзём, вядзём за сабой песню, быццам ад хаты ў хату вяровачку. Бабка расказвала, што песні яе ідуць ад яе бабкі, і яшчэ далей...

Зноў: рука на руку перад сабою, вочы — туды, у акно, дзе палымнее восень, і яшчэ адна песня ажывае ў хаце: «Каля рэчкі, каля броду — там тры дзеванькі гулялі. Адна дзеванька запела, другая заплакала, а трэцяя, меншая, стала рэчы гаварыць. Не плач дзеўка, не плач красна, ты не лі слёз напрасна. Прамяняла ты свой розум ды на войтаўскую совесць. А што ў войта твайго совесць — як на травачцы расіца. Вецер ўзвее, сонца ўгрэе, раса на раку ападзе, толькі ж цябе, мая дзеўка, войт не возьме. Стала дзеўка тужыць-плакаць, горкі слёзкі праліваць, ажно з тых горкіх слёзак стала рэчка працякаць...»

І зноў — пра бабку, чалавека, жыццё з якім запоўніла душу не толькі празрыстымі, як з казкі, словамі, развешанымі, што званочкі, на правадах самабытнай мелодыі. Праз бабчыну песню ўзята нешта большае, ад чаго мацнее сам чалавек: так ад сокаў зямных буяюць дрэвы, кветкі, травы, жыта. Нездарма і гаворка ўвесь час перакідваецца ад песні — да Агаф'і Міхайлаўны, ад Агаф'і Міхайлаўны — да песні, а яшчэ — на травы, птушак... Праспявае, скажам, Ніна Сямёнаўна «Як на травачцы расіца...» — тут жа і прыгадае:

— Любілі з бабкай уставаць рана-раненька, па расіцы тапаць у ягады, грыбы. Саб'е на далонь расінку з травінкі, к малім вачам паднясе. Доўга дзівуецца. А то з песнямі ў травы ідзём. Бяром цынтаўрыю — ад сэрца. Чабарок — на чаёк. Багун — бадрун. Падбел — кроў спыніць. Трыпутнік — балячку загоіць. Сямёнава кроў — ад усіх хвароб. У прывычку так увайшло, што ўбачыш верасок — пра верасок песню запяеш, чабарок — пра чабарок...

Чаму так: іншыя разы едзеш і едзеш асфальтаванымі, брукаванымі, пясчанымі дарогамі, пытаешся, прыглядаешся, прыслухоўваешся і... не знаходзіш таго песеннага россыпу, як раптам напаткаеш недзе ў адной вёсцы, на вузкай сцяжынцы, у адной хаце, ад аднаго чалавека. Чаму так: за некалькі дзён у суседніх раёнах не сустрэў я тых песень, што мае кароткая дарога па Касцюковіцкім. У тых жа Бялынкавічах, Калодліве, Белай Дуброве, Брацькавічах песні ходзяць з хаты ў хаты, з вёскі ў вёску. Можа іншыя сцежкі паміж хатамі? Ва ўсякім разе, тут, у Касцюковіцкім раёне, ёсць людзі, якія могуць падтрымаць вясковую песню, даць ёй узлёт, па правадах радыё і газетных радках пусціць яе ў іншыя вёскі. Маю на ўвазе хаця б таго ж Пацёмкіна. Вось пачуў і тут жа запісаў песні Бялугінай, перадаў іх па раённаму радыё; арганізаваўся ў Бялынкавічах самадзейны хор, і ён напісаў для яго цікавую жартоўную песню «Прымакі»; на чыгуначнай станцыі Камунары адшукаў надзвычай самабытных выканаўцаў народных песень зусім старых людзей мужа і жонку Маскалёвых — прыехаў, дапамог парадамі, кнігамі...

Да Ільі Давыдавіча Маскалёва ён прывёў і мяне.

Чыгунка. Разбягаюцца на два бакі рэйкі. Праходзяць цягнікі. Маленькая хатка вартаўніка стаіць пры чыгунцы, пасярод зялёнага лужка. У хатцы: крокі тры — ад сцяны да грубачкі, ад парога — да акна. Паляўнічая стрэльба на сцяне, процівагаз. Ля акна — стол, на стале — пачак махоркі, тэлефонны апарат, кніга разгорнута — «Родныя паэты». І сшытак, на белай старонцы якога выведзены першыя радкі верша. Свайго...

— У вартаўніка час бывае і на кніжкі. Сам пішу. Паслухайце: «На працу, а мо і ў дарогу бярыце вы песню з сабой...»

Затым сядзім ужо ў хаце Ільі Давыдавіча.

— Хвядосаўна, ідзі сюды, госці песню просяць, — гукае гаспадар жонку і Клаўдзія Хвядосаўна садзіцца побач з мужам.

— Ну, якую? Са старых?

— Гэту, «Худа сіраціне»... Потым свае...

Худа, худа сіраціне
На чужой дальняй старонцы,
Што не к каму сіраціне
Галовачкі прыхінуці.
Прыхіну я галовачку,
Ды к зялёнаму дубочку.
Дуб зялёны, ліст шырокі
Нічагенька не гавораць.
Дуб зялёны — не татачка,
Ліст шырокі — не мамачка...

— У нашай вёсцы Сілічы, адтуль мы родам, душа песенная. Пасвіш, бывала, каровак, коней, чуеш птушак і пад іхнія галасы спяваеш сваё. І словы знаходзяцца, і мелодыя. Цяпер спяваем у сваёй хаце, у суседзяў. Во на вяселле запрасіў спяваць Пятрок Кірпічэнка, машыніст вадакачкі. З песнямі запрашалі і ў Сілічы, землякі. Ездзіў туды. А то школьнікі пісалі пісьмы, хочуць нашы спевы паслухаць...

Тут аказваецца, што Ілья Давыдавіч і Клаўдзія Хвядосаўна не толькі спяваюць, але і збіраюць песні колькі ўжо гадоў. Пазапісвалі тыя, што самі з малых гадоў памяталі, пасля пачалі ад людзей збіраць. За песняй выхадзілі нямала вёсак. К таму ж — Ілья Давыдавіч і сам складае. Ужо ў гэтых песнях, сваіх, зусім іншыя словы, іншы настрой, толькі манера выканання захавалася тая ж, народная: «...Радзіма. Над табой сонца яснае свеціць. Песняй слаўлю я шчасця прыход», — спявае стары пра сённяшні дзень. Або — з «Застольнай»: «Сядзем кругам за сталом, песню радасці спяём. Людзі сталі гаварыць, што ўсе добра сталі жыць. Паглядзіце навакол і на наш багаты стол. Людцы добрыя мае, чаго толькі нестае...»

Песні, створаныя і праспяваныя Маскалёвымі, пачуеш сёння не толькі ў хаце Маскалёвых, што стаіць побач з маленькай чыгуначнай станцыяй Камунары.

... Абапал восеньскай дарогі шуміць лес. Чые ж ён песні спявае? Можа таксама песні матак і бабак сваіх, ад якіх век вядзе? Бо і зямля, і дрэвы, і травы, як мы, людзі, не могуць не ведаць сваё мінулае, як і сённяшні дзень. Іначай развучацца пладаносіць, проста перастануць быць самі сабою, перастануць быць — зямлёю, дрэвамі, травамі.

І таму — спявае лес, спяваюць палеткі, спявае дарога пад коламі...

В. КАРАМАЗАЎ,
спец. кар. «Літаратуры і мастацтва».

ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАЙ!

За заслугі ў развіцці беларускай савецкай літаратуры і ў сувязі з шасцідзесяцігоддзем з дня нараджэння пісьменнік Каратай Аляксандр Амвросьевіч (Максім Лужанін) узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

■

За заслугі ў развіцці тэатральнага мастацтва і ў сувязі з шасцідзесяцігоддзем з дня нараджэння галоўны рэжысёр Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра Струнін Аляксандр Пятровіч узнагароджаны Ганаровай Граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

ЛЮДЗІ, БУДЗЬЦЕ ПІЛЬНЫЯ!

Гэты заклік прыгадваеш, чуючы Хатынскія званы.

Пякельны боль працінае цябе пры адным толькі ўпамінанні пра хатынскую трагедыю.

І калі глядзіш на графічныя лісты мастака Марка Жытніцкага, разумееш яго імкненне сказаць сваё слова пра свяшчэнны боль.

Гэтыя лісты-алегорыі называюцца «Разбуранае гняздо», «Хатынская калыханка», «Памяць»...

НАСУСТРАЧ ЗНАМЯНАЛЬНАЙ ДАЦЕ

З пленума праўлення Саюза мастакоў БССР

ПАЎГОДА засталося да знамянальнай даты — 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна. На ленінскай вахце стаяць сёння рабочыя, калгаснікі, служачыя, дзеячы навукі і культуры. Клопатамі па падрыхтоўцы да гэтай даты жывуць і беларускія мастакі.

У пачатку наступнага года ў сталіцы рэспублікі адкрыецца вялікая мастацкая выстаўка «Па ленінскім шляху». Ёй будуць папярэднічаць мастацкія выстаўкі ў абласцях. Поспех гэтых выставак будзе забяспечаны толькі тады, калі іх аснову складуць высокаідэйныя, прасякнутыя камуністычнай партыйнасцю, дасканалыя па мастацкім увасабленні новыя творы, у якіх ажывае вобраз Уладзіміра Ільіча, вобразы камуністаў, змагароў за ленінскія ідэалы ў часы рэвалюцыйнага змагання, у гады мірнага будаўніцтва і ў суровы час ваенных выпрабаванняў.

Абмеркаваць падрыхтоўку мастакоў рэспублікі да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, падсумаваць зробленае, унесці карэктывы ў складзеныя раней планы, вызначыць недахопы і намеціць шляхі іх выпраўлення — такая задача стаяла перад пленумам праўлення Саюза мастакоў БССР, які адбыўся 30 кастрычніка.

З даклада старшыні праўлення Саюза мастакоў В. Грамыкі, з выступленняў старшыні праўлення Мастацкага фонду БССР, кіраўнікоў творчых секцый жывапісу, скульптуры, графікі, дэкаратыўна - прыкладнога мастацтва, упаўнаважаных абласных калектываў мастакоў выявілася досыць выразная карціна жыцця творчага саюза.

Акрэсліваюцца пэўныя контуры будучай рэспубліканскай выстаўкі. У майстэрнях мастакоў ствараюцца творы, значныя па задуме, якія складуць ядро экспазіцыі.

Так, напрыклад, тэме «Ленін і народ» прысвячаюцца скульптурная кампазіцыя В. Палійчука, жывапісныя кампазіцыі Я. Зайцава, А. Шыбнёва, Ф. Дарашэвіча, М. Савіцкага, П. Крохалева. Пераважна гэта будуць творы шматпланавых, са складанай філасофскай структурай.

Вобраз У. І. Леніна — у новых творах З. Азгура, С. Раманава, М. Моўчана, П. Данелі, Э. Куфко і іншых мастакоў.

Слаўнай ленінскай гвардыі камуністаў аддаюць сваё натхненне жывапісцы, якія працуюць над гісторыка - рэвалюцыйнай тэмай. Кампазіцыя М. Манасзона «На досвітку рэвалюцыі» прысвечана І з'езду РСДРП. Пра першы Усерасійскі з'езд Саветаў — новая карціна Х. Ліўшыца. Рамантыка грамадзянскай вайны ажыве ў кампазіцыі Р. Кудрэвіч і А. Гугеля «Грэнада». Аб салдатах Кастрычніка піша карціну А. Забораў. Гісторыя Рудабельскай рэспублікі ўсхвалявала П. Крохалева. Тэматыцы Вялікага Кастрычніка і першых паслякастрычніцкіх гадоў прысвечаны творы, якія на станках у майстэрнях М. Беляніцкага, Я. Харытоненкі, Л. Асядоўскага, В Ярмоленкі, У. Стальмашонка. «Сказ пра Беларусь» — тэма, якую распрацоўвае ў алегарычным плане І. Давідовіч.

У радзе выступленняў на пленуме прагучала заклапочанасць з прычыны пэўнага зніжэння актыўнасці мастакоў у распрацоўцы тэмы нашай сучаснасці. Праўда, гэта не азначае, быццам твораў на гэту тэму ствараецца мала. Так, называліся, напрыклад, новыя творчыя задумы карцін аб сучасным рабочым класе В. Сахненкі, Г. Паплаўскага, Г. Вашчанкі, Л. Шчэмелева, работы Б. Аракчэева, А. Паслядовіч і іншых мастакоў, прысвечаныя працаўнікам сельскай гаспадаркі. Але на пленуме слушна адзначалася, што справа не толькі ў тым, каб было больш твораў пра наш сённяшні дзень, пра сённяшнія здзяйсненні савецкага чалавека — трэба яшчэ, каб тэма ў такіх творах вырашалася глыбока, каб яна ўвасаблялася дакладнымі і дасканалымі мастацкімі сродкамі.

Аб ваенна-патрыятычнай тэме гаварылася, што асноўная ўвага мастакоў аддаецца падзеям Вялікай Айчыннай вайны. І. Ахрэмчык, напрыклад, працягвае творчыя пошукі ў тэме Брэсцкай эпапеі. Характару савецкага чалавека — франтавіка і партызана прысвячаюцца новыя творы І. Стасевіча. Ф. Бараноўскага, І. Казлоўскага, А. Кашкурэвіча. А вось пра сучасную Савецкую Армію, пра яе будні, пра вучобу воінаў творчых заявак пакуль што малавата. Названы толькі задумы Л. Асецкага (аб будзнях ваенных маракоў) і Н. Воранава (карціна «Манеўры»).

Важным раздзелам выстаўкі «Па ленінскім шляху» стануць пейзажы, створаныя беларускімі мастакамі. Многія жывапісцы і графікі пабывалі ў творчых паездках за мяжой і па нашай краіне, назапасілі значны матэрыял для твораў аб мясцінах, дзе жыў і працаваў Ільіч у розныя гады. Над пейзажамі ленінскіх мясцін працуюць сёння В. Бярсоцкі, Я. Раздзялоўская, У. Садзін, М. Даўгяла і многія іншыя.

Пейзаж сучаснай Беларусі, зямля, пераўтвораная рукамі працоўнага чалавека, родная прырода — змест новых твораў В. Цвірко, С. Каткова, І. Карасёва, І. Басава і многіх іншых нашых пейзажыстаў.

Творчыя праблемы партрэта, манументальных жанраў, графікі, дэкаратыўна - прыкладнога мастацтва, шматлікія арганізацыйныя пытанні таксама абмяркоўваліся на пленуме.

Зусім зразумела, што падрыхтоўка да ленінскага юбілею не зводзіцца толькі да работы над новымі творамі. Шмат увагі аддаюць мастакі і мастацтвазнаўцы сталіцы рэспублікі і абласцей прапагандзе беларускай Ленініяны, папулярызацыі дасягненняў беларускага выяўленчага мастацтва. Мастакі сустракаюцца з гледачамі на прадпрыемствах і ў калгасах, чытаюць лекцыі, расказваюць аб рабоце над новымі творамі, дапамагаюць афармляць ленінскія куткі на прадпрыемствах і ва ўстановах, кансультуюць самадзейных мастакоў. Але ўсё ж галоўнае, па чым будзе меркаваць народ аб творчай актыўнасці нашых мастакоў, — гэта іх творы. Новыя творы аб Леніне і ленінцах, аб Камуністычнай партыі і нашым сучаснику ва ўсіх праявах яго шматграннай дзейнасці.

Падрыхтоўка кожнага мастака да выстаўкі «Па ленінскім шляху» патрабуе ад яго высокага пачуцця адказнасці. І пра што б ні гаварылі новыя творы мастака — пра самога Ільіча і пра яго паплечнікаў, пра герояў рэвалюцыі і пра нашых сучаснікаў, пра ленінскія мясціны і пра родныя краявіды, — яны павінны быць напісаны так, каб экспазіцыя выстаўкі дала магчымасць гледачу адчуць: Ленін з намі заўсёды, Ленін жывы сярод жывых, Ленін — заўсёды наперадзе.

Такой была адзінадушная думка ўдзельнікаў пленума.

Ул. БОЙКА.

НА ГАСТРОЛІ Ў ПОЛЬШЧУ

Сёлета ў жніўні на Віцебшчыне гасцяваў Любанскі ансамбль песні і танца Зеленагурскага ваяводства Польскай Народнай Рэспублікі. Самадзейны калектыў даў пяць канцэртаў у Віцебску, Оршы, Наваполацку і Лукомлі.

31 кастрычніка з візітам ў адказ выехаў у Польшчу Віцебскі народны ансамбль «Колас». Суправаджаюць ансамбль эстрадны аркестр, салісты — спевакі, інструменталісты і чытальнікі. Самадзейны калектыў прабудзе ў Зеленагурскім ваяводстве да 8 лістапада і пакажа польскім сябрам сваё майстэрства.

Віцябляне павезлі вялікую і цікавую праграму. Удзельнікі ансамбля пакажуць карагод «Колас», цікавыя і арыгінальныя танцы «Каханачка», «Цапы», «Воранаўская кадрыля», «Антон маладзенькі», «Язвінскія ўзоры». Усе яны заснаваны на мясцовым танцавальным фальклоры і ярка пастаўлены заслужаным дзеячом культуры БССР К. Партным. Спецыяльна, у якасці сюрпрыза, падрыхтаваны і польскі народны танец «Абэран». Акрамя гэтага будуць паказаны «Малдаўскі сувенір», «Першая конная», «Сучасныя рытмы», «Старажытная руская карцінка», рускі народны танец «Ля ваколіцы».

Спявачка Ася Мінаева будзе выконваць беларускую народную песню «Чабарок», песню Ю. Семяняки «Не за вочы чорныя» і іншыя, Генадзь Бярозка — песні «Нёман» Н. Сакалоўскага і «Масквічы» А. Эшпая. У дуэце пакажуць сваё майстэрства Мікалай Коржанеў і Сцяпан Добель, выканаўцы жартоўных частушак. Віртуоз ігры на мандаліне Эдуард Сладкевіч уключыў у праграму «Паланез» М. Агінскага і «Беларускую фантазію» Л. Маркевіча.

П. АНДРЭЕУ.

ТЭРМІНОВА. БЕЗ ЧАРГІ...

Сустрэча з героямі будучага фільма

НАДВОР'Е сапсавалася. І хоць мы чакалі гэтага — на тое і восень — усё роўна спадзяваліся, што дзівадзівоснае — бабіна лета — не кончыцца.

Але надвор'е сапсавалася. Гэта адбылося якраз у тыя дні, калі здымачная група «Беларусьфільма» на чале з рэжысёрам Юрыем Лысятавым выправілася ў Верхнядзвінск, каб пачаць здымкі фільма «Толькі адна тэлеграма».

Падзьмуў вецер, парывісты і злосны. Ён нагнаў хмары, здавалася, з усяго свету. Занудзіў дождж — той самы, у якім колькі ні шукай — не знойдзеш паэзіі.

Знікла «натура», як кажуць кіношнікі. Яны склалі апаратуру і паехалі. А я? Я не магу вяртацца ў рэдакцыю з чыстым блакнотам, тым больш, што спрабавала ўжо ўявіць, які будзе гэты фільм...

Люты 1918 года. Імперыялістычная Германія, парушыўшы перамір'е з маладой Савецкай рэспублікай, пачала ваенныя дзеянні. Краіне было цяжка. Чырвоная Армія яшчэ толькі-толькі стваралася. І Ленін робіць усё, каб зноў пачаць мірныя перагаворы з Германіяй.

Але прычым тут Дрыса — так раней называўся Верхнядзвінск?

...Маленькі правінцыяльны гарадок на поўначы Беларусі. Як гаварыў гогалеўскі Гарадничы: адсюль хоць тры гады скачы, ні да якой дзяржавы не дасканаш. Спакой. Непарушны. Сталы.

Але грымнула рэвалюцыя, і азарыла гарадок. У снежні семнаццатага тут быў утвораны Савет рабочых, салдацкіх, сялянскіх і батрацкіх дэпутатаў Дрысенскага павета. І вось адсюль, з Дрысы была адпраўлена тэлеграма Уладзіміру Ільічу Леніну:

«Тэрмінова без чаргі Птргд Савету Народных Камісараў копія Віцебскаму губсавету з Дрысы прын 19/2 1918 у 1 гадз.

Немцы занялі Дзвінск і рухаюцца далей. Тэлеграфуйце тэрмінова, што рабіць Дрысенскаму саўдэпу, секцыям, казначэйствам у выпадку набліжэння немцаў да Дрысы.

Старшыня Дрысенскага саўдэпа Урбан».

Савецкай уладзе ледзь споўнілася сто дзён. Яшчэ нядаўна рабочы і селянін, апрануты ў салдацкі шынель, кідаў зброю, не жадаючы ваяваць за цара і памешчыка. Цяпер, усім сэрцам паверыўшы ў Савецкую ўладу, сваю ўладу, ён гатовы быў жыццём сваім абараняць яе ад ворагаў.

Вось чаму з маленькай Дрысы ў чырвоны Петраград, у штаб рэвалюцыі Смольны ішла па правадах тэлеграма правадыру: «Тэлеграфуйце тэрмінова, што рабіць...»

Але хто ж такі Урбан?

Звяртаюся з гэтым пытаннем да ўсіх, хто мог ведаць Луку Урбана. І чую ў адказ адно: не ведаю, не ведаю, не памятаю... У Верхнядзвінскім райкоме партыі таксама нічога дакладнага пра Луку Урбана расказаць не могуць. Але кіламетраў за 30—40 знаходзіцца сяло Антонава, там паўвёскі жыхароў — Урбаны.

І вось я ў Антонаве. Мне ўспомніліся нечыя словы: вецер не толькі гасіць полымя, але і раздзьмухвае яго... Той самы вецер, што нагнаў хмары — развеяў іх і выглянула сонейка. Быццам па заказу спецыяльна, каб я ўбачыла Антонава ва ўсім хараство. Вёсачка ў старым сасновым бары. Магутныя дрэвы стаяць як вечныя вартавыя...

— Так, Урбанаў у нас многа, — гаворыць Міхаіл Сяргеевіч Урбан. — 23 Урбаны ваявалі, 12 не вярнуліся, загінулі. Хто на Украіне, хто пад Ленінградам, хто тут, у Беларусі. А я вось вярнуўся... Сляпы.

Я разумею, што ў такія хвіліны ніякія словы не дапамогуць. І маўчу.

Міхаіл Сяргеевіч Урбан успамінае.

Тады, у сорак другім, ён быў проста Міша, Мішка... І было яму ад роду семнаццаць гадоў. Вёска Антонава — яго радзіма. Тут нарадзіўся і жыў яго прадзед, і дзед, і бацька. Праўда, бацька яшчэ да рэвалюцыі выязджаў у Піцер, на заробкі. Там ён працаваў на Пуцілаўскім заводзе, там, відаць, і духу мяцежнага набраўся і сынам яго перадаў.

— Лука Урбан таксама з нашых...

У пакой увайшла жанчына.

— Мая, — усміхнуўся Міхаіл Сяргеевіч.

— Прыгожая, — сказала я, калі яна пайшла.

— Не ведаю, дрэнна помню... Да вайны яшчэ дзяўчынкай была.

Тады, у сорак першым, калі пачалася вайна, Міша яшчэ не ведаў, які страшэнны лёс наканаваны яму. А калі б і ведаў? Што — калі б і ведаў?..

Я слухаю просты, няхітры расказ Мішы Урбана, ужо знаёмы расказ аб тым, як з'явіўся ў вёсцы кадравы афіцэр, які вырваўся з акружэння, і як ён дастаў зброю, і як падняў усю антонаўскую моладзь на барацьбу з ворагам. І аб тым, як немцы пранюхалі пра гэтую зброю і схапілі хлопцаў.

— Схапілі тады Сцёпку, Кірылу, Жэньку, мяне — Урбаны ўсе. Білі нас фашысты, аж стаміліся, а мы маўчым. На мост вывелі і трубкамі ад процігазаў, набітымі пяском, білі... Не прызналіся мы.

Міхаіл Сяргеевіч скіраваў невідучыя вочы кудысьці ўгору, быццам так яму было лягчэй успамінаць, і доўга маўчаў. Зноў пасыпаў дождж. Шэры змрок прыліп да акна.

— Так, зусім забыўся, афіцэр, што выйшаў з акружэння — таму Луку Урбану, якім вы цікавіцеся, пляменнікам даводзіўся. Самога Луку Барысавіча не ведаю. Ён, кажуць, у 1918 на фронт пайшоў і не вярнуўся. А вось брата яго, Віктара Барысавіча, добра памятаю. У яго было шмат кніг па марксізму. Чытаў ён многа і нас усё прывучаў. Як бы цяжка ні было, што б ні здарылася, ён заўсёды гаварыў сваю запаветную фразу: «Савецкую ўладу перамагчы нельга». Мы часта потым успаміналі гэтыя яго словы.

У першай Дрысенскай партызанскай брыгадзе нёс Міхась сваю службу: пераходзіў праз лінію фронту, хадзіў у разведку, шэсць эшалонаў пусціў пад адхон, разбіраў пуці... Апошняе заданне ён выканаў 5 снежня 1943 года. Тады разам з Жэнем Урбанам і іншымі хлопцамі ён павінен быў узарваць чыгуначныя пуці. Жэня з гэтага задання не вярнуўся — узарваўся на варожай міне, а Міхась быў цяжка паранены.

— Дамоў я толькі ў сорак шостым вярнуўся. Бацька пахавальную ўжо атрымаў. Мне яе прачыталі. Вы, напэўна, не ведаеце, што гэта такое, калі табе тваю пахавальную чытаюць...

Не скасіла яго куля варожая... Не здаўся ён, выстаяў пасля вайны. Хто ведае, што цяжэй было... А потым адчуў — патрэбны людзям. У Антонаве і не ўяўляюць ужо, як без яго. Да яго ідуць і за парадай, і за суцяшэннем. І навіны калгасныя ён у першую чаргу ведае. У вёсцы яго празвалі «Наш камендант».

Я толькі хацела сказаць, што калі б Лука Барысавіч ведаў, якія Урбаны будуць жыць пасля яго, ён бы, напэўна, быў шчаслівы, але Міхаіл Сяргеевіч, быццам угадаўшы мае думкі, сказаў:

Адбыўся вялікі канцэрт-сустрэча грамадскасці Мінска з беларускімі кампазітарамі. Упершыню выконвалася Сімфанічная паэма М. Аладава «Народ і правадыр» і Першы канцэрт для фартэпіяна з аркестрам («Капрычас») С. Картэса. Слухачы цёпла сустрэлі і выкананне скрыпічнага канцэрта П. Падкавырава і кантаты «Казка пра мядзведзіху» А. Багатырова.

На здымку: М. Аладаў і С. Картэс сярод слухачоў.

Фота Ул. КРУКА.

ЯК ГЭТА БЫЛО

ПРЫЙШОЎШЫ з паходу па фінскаму ўзбярэжжу, нас, некалькі мінаносцаў, спынілася ў Гельсінгфорсе з тым, каб набраць прыпасаў і ісці зноў у мора. Але раніцай 24 кастрычніка радыёграмай Цэнтрбалтфлота было паведамлена, каб эскадронныя мінаносцы «Забіяка» і «Канстанцін» ішлі зараз жа ў Петраград, дзе пачалося паўстанне рабочых супраць урада Керанскага. Судавым камітэтам быў скліканы сход усяго экіпажа карабля. Аднагалосна было вырашана ісці. Аставалася адно: ці згодзіцца выконваючы абавязкі камандзіра старшы афіцэр лейтэнант Балка весці карабель. На гэта Балка адказаў згодай. Характэрнай адзнакай яго шчырага жадання можа служыць адна акалічнасць— гэта тое, што ён, каб не траціць часу на хадзьбу па карту ў штаб, узяўся весці карабель без карты, кажучы, што да Петраграда не так далёка, каб можна было збіцца з курсу, або папасці на скалу.

Падняўся чырвоны сцяг на мачце, закрасаваўся белым па чырвонаму напісаны лозунг: «Уся ўлада Саветам!». «Забіяка» і «Канстанцін» выйшлі з гавані. Як заўсёды, злосна шугала мора сваімі няспыннымі хвалямі. Дзьмуў асенні рэзкі вецер і, здавалася, падганяў бег двух караблёў, якім і без яго трэба было спяшацца.

На палубах кучкі матросаў абмяркоўвалі падзеі. На борце «Забіякі» былі дабравольцы і з іншых караблёў. Усе яны самаахвярна ішлі каб перамагчы, або загінуць за вызваленне пралетарыята.

Караблі што раз усё больш і больш прыбаўлялі ходу. Валы марскіх хваль то прылівалі, ліжучы барты, то адлівалі або зліваліся з адным магутным белапенным, высокім бурлячым валам за кармой, які нёсся назад у марскую бязмежнасць.

На тварах ва ўсіх быў адбітак нейкае ўрачыстасці, у вачах зіхацеў агонь нейкага буянага запалу. Кожны адчуваў, што ён, як адзінка нечага магутнага цэлага, бязмежнага ў сваім жаданні, можа ўздрыгануць самыя моцныя ўстоі і разбурыць перашкоды на сваім шляху да перамогі.

Вельмі многа прыйшлося перажыць. Вельмі многа патрачана марна надзей на хуткі канец вайны. Адчувалася патрэба змен у агульным жыцці і ў жыцці ваенным.

У надвячэрнім змроку паказаліся на гарызонце велізарныя трубы Кранштата...

Але мінаем, робім паварот налева і праз кароткі час уваходзім у канал, што злучае Фінскую затоку з Нявой. Смутна гараць агні ў Петраградзе. Чуецца рэдкая страляніна з ружжаў і частая з кулямётаў. Значыць, пачалося. Ідзём далей. Звычайнага грукату жыцця не чуваць. Усё злілося ў адзін парахавы гул і сталёвы свіст. Праходзім Мікалаеўскі мост і падыходзім да Дварцовага. На рэйдзе Нявы стаіць ужо некалькі караблёў, сярод іх ёсць вялікія і малыя. Распазнаём у змроку абрыс «Аўроры». Стаяць згруджана. Наведзены жэрлы гармат на Зімні палац. Аддалі якары. Сталі. Спускаюцца шлюпкі, кацеры для сувязі. Падаецца каманда: усе па месцах, дэсанту падрыхтавацца на берег!

На маю долю выпала трымаць сувязь з караблямі і Петрапаўлаўскай крэпасцю. У крэпасці заселі юнкеры. Моцна трымаюцца. У прамежкі між агульным грукатам і гулам чутна, як праз Няву перагукваюцца паасобныя стрэлы Петрапаўлаўкі з стрэламі каля Зімняга палаца.

Сігнал караблям быў такі: калі на Клётыку Петрапаўлаўскай крэпасці загарыцца агонь, тады распачынаць стральбу па Зімняму палацу. Гэтага сігнала не дачакацца. Усе пазіраюць на крэпасць. Трэба даведацца, што робіцца ў Петрапаўлаўцы. Я і яшчэ адзін на маторным кацеры едзем.

Кацер, як шчупак, непрыкметна коўзаецца па хвалях бунтоўнае Нявы, пераскоквае з валу на вал. Ідзём паўз берагу Універсітэцкай і Біржавай набярэжнай. Спадзяёмся, што з процілеглага берагу, ад Зімняга палаца, нас не прыкмецяць. Але — заўважылі. Адкрылі стральбу з кулямётаў. Свішчуць кулі каля вушэй, падаюць каля самых бартоў кацера, урэзваюцца ў ваду або слізгаюцца па ёй і абдаюць пырскамі. Даём самы поўны ход. Але не ўцячы. Падыходзім да баржы, што стаіць пустой каля берагу. У тры мігі прышвартоўваем кацер, а самі хаваемся ў баржы, каб перачакаць, пакуль перастане стральба.

Ашукалі. Неўзабаве град куль перастае сыпацца. Садзімся на кацер. Едзем. Недалёка ад крэпасці злазім. Ідзём пехатою. Сустракаемся з камендорам «Забіякі» Хаменка, які камандуе атрадам матросаў. Кажа, што крэпасць хутка здасца. Едзем назад. Каля Зімняга палаца стральба надзвычайная. Пад'ехалі да барта «Аўроры», перадалі пакет. Караблі стаяць, ашчаціні́ўшыся, нібы вожыкі. Толькі пад'ехалі да «Забіякі», паспелі толькі што ўзыйсці на палубу, як з «Аўроры» гулка, прарэзваючы халоднае паветра, пранёсся залп, у далях адазваўся рэхам. Грукат стрэльбаў, кулямётаў каля Зімняга палаца адразу сціх. Але не надоўга. Праз некалькі хвілін пачалася зноў стральба, больш заўзятая, больш гулкая. Яшчэ пачакаўшы, з Петрапаўлаўскай крэпасці, асвятляючы траекторыямі змрок, адзін за другім, з свістам праз Няву з крэпасці праносяцца снарады. Недзе падаюць з грукатам і трэскам. Ба-ба-а-а-х!..

На «Забіяку» падаецца каманда: усім вольным ад вахты падрыхтавацца на берег. Узбройваемся і ідзём.

На пляцу Зімняга палаца кучы дроў — гэта барыкады. Там, па той бок, юнкеры, жаночыя батальёны; тут, па гэты бок, матросы, рабочыя, чырвонагвардзейцы. Тут і там ляжаць забітыя і параненыя. Многа іх. Свішчуць кулі, урэзваюцца ў дровы, слізгаюцца з трэскам па бруку, па пазлях, датыкаюцца да сцен камяніц, адскокваюць і рыкашэтам імчацца назад. Змаганцы наступаюць. Некаторыя валяцца скошанаю травой. Кроў, енк, грукат.

Яшчэ прыходзяць новыя сілы. Робіцца весялей на сэрцы. Яшчэ напор — і Зімні палац у нашых руках. Расставляюцца патрулі. Ходзяць чуткі, што Керанскі, пераапрануўшыся ва ўбранне сястры міласердзія, уцёк. Ідзём на карабель.

Раніцай на другі дзень паведамляюць, што каля Міхайлаўскага манежу юнкерамі перабіты патруль. Гэта абурае. Ідзём ў Міхайлаўскае вучылішча, каб раззброіць юнкераў. У вучылішчы нікога не застаем.

Пазіцыйна бойка скончылася, але сягды-тагды робіцца то там, то тут налёты. Некалькі чалавек жаночага батальёну з-за рога вуліцы абстралялі каманду на верхняй палубе «Забіякі». Уцяклі ад нашай пагоні. Робіцца частыя наскокі на маёмасць Зімняга палаца. Чырвонагвардзейцы не могуць справіцца. Ідзём на падмогу. Праз некалькі дзён сэрца рэвалюцыі —Петраград — вольна б'ецца, але за ім — у Царскім сяле, у Гатчыне і іншых месцах — гуртуюцца вялікія сілы. Ходзяць чуткі, што сам Керанскі на броняпоездзе пад'язджае блізка да Мікалаеўскага вакзала. Нагол браняпаязды і бранявыя аўтамабілі пушчаны ў ход, каб прабіць сцяну абароны да Петраграда.

Караблям даецца загад заняць выгодныя пазіцыі, каб абстрэльваць рух ворага па чыгунках. «Забіяку» прыпадае ісці ў сяло Рыбацкае, каб абараняць подступы да Мікалаеўскага вакзала.

Ідзём уначы. Праходзім мост за мостам уверх па Няве. Становімся на якар. Ставім варту на беразе. Трымаем сувязь з сіламі, якія змагаюцца за подступы да Петраграда. Праз некалькі дзён сілы Часовага ўрада былі зломлены, і мы пад гімн перамогі вярнуліся ў Гельсінгфорс.

Публікацыя М. КАМІНСКАГА.

ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

МІКАЛАЮ ГАРУЛЁВУ — 50 ГАДОЎ

Спаўняецца 50 гадоў паэту і празаіку Мікалаю Гарулёву.

З гэтай прычыны праўленне Саюза пісьменнікаў БССР накіравала юбіляру віншаванне, у якім гаворыцца:

«Дарагі Мікалай Аляксандравіч!

Шчыра вітаем Вас і шлем Вам свае сяброўскія віншаванні ў дзень Вашага пяцідзесяцігоддзя!

Вашы першыя вершы з'явіліся ў друку ў 1939 годзе. Такім чынам Вы працуеце ў літаратуры ўжо трыццаць год. На Вашым творчым рахунку — вершы, аповесці, п'есы. Асабліва паспяхова працуеце Вы ў жанры драматургіі: шэраг Вашых п'ес, прысвечаных жыццю нашага сучасніка, пастаўлены тэатрамі рэспублікі і прыхільна сустрэты гледачом.

Не можам не ацаніць таксама Ваш актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Саюза пісьменнікаў.

Жадаем Вам моцнага здароўя і новых творчых поспехаў».

Рэдакцыя газеты «Літаратура і мастацтва» далучаецца да гэтага прывітання.

— Толькі не падумайце, што ў нас у Антонаве адны Урбаны заявалі. Гэта я так, да слова. Зараз усіх назаву.

Ён закінуў галаву і пачаў лічыць:

— Кірыла—адзін, Сцёпка—два, Яшка — тры, Ніна-кулямётчыца — чатыры, Анютка, Толік, Вера...

З сакратаром партыйнай арганізацыі Рыгорам Ануфрыевічам Урбанам мы імчым па выбітай прасёлачнай дарозе. Грузавік, які рознае бачыў, крэкча, буксуе, глухне і зноў ажывае... Мы, як касманаўты, то адчуваем бязважкасць, то перагрузкі. Едзем у Зялёнаўшчыну. Адтуль трэба прывезці людзей на цэнтральную сядзібу калгаса, дзе выступяць артысты з Латвіі.

У кароткія хвіліны «перадышкі», калі дарога была роўная, Рыгор Ануфрыевіч расказваў мне, што ў калгасе 242 двары, 105 тэлевізараў, 2 легкавыя аўтамашыны, 52 матацыклы, сярэдняя аплата за чалавекадзень 3 рублі 78 капеек.

— Ну, а калі хочаце — вось яшчэ адзін паказчык дабрабыту, але гэта, канечне, не для друку: у нас не гоняць самагонку. Так, так, за святочным сталом самагонкі не ўбачыш. П'юць «сталічную» і каньяк. Усміхаецеся, а вы ў любога старшыні калгаса спытайцеся, ён вам скажа, які гэта паказчык.

Уверх-уніз... Уверх-уніз. Не грузавік — звер. Цікава, што будуць здымаць кіношнікі? Хаця, як гэта — што? Міхася здымуць і гэтага, што побач сядзіць, Урбана. Відаць, ёсць у іх нешта ад таго Лукі.

— Скажыце, пра Луку Барысавіча Урбана вы што-небудзь ведаеце?

— Чуў шмат чаго. Кажуць, адукаваны быў чалавек. Сумленны, вельмі смелы. Бальшавік. А я толькі яго аднафамілец і нарадзіўся пазней...

Машына спынілася. Мы выйшлі. Ля дарогі стаяў сціплы помнік невядомаму салдату.

І зноў наш грузавік імчыць наперад.

— А ведаеце, хутка ў нас вяселле. Мікалай Урбан жэніцца. Наш механізатар.

Зноў Урбан... І ў рэвалюцыю Урбаны, і на вайне, і зараз хлеб вырошчваюць...

Ну, канечне ж, даведацца што-небудзь пра Луку Урбана можна хутчэй за ўсё ў старых. І я сустрэлася з Кірылам Дзмітрыевічам Урбанам, былым старшынёй сельсавета, старым членам партыі, 75 гадоў яму зараз — дзесяць заяваў. І ў першую сусветную давялося, і ў грамадзянскую, і ў Айчынную...

У той люты васемнаццатага, калі немцы падступалі да Дрысы, пайшоў ён у Чырвоную гвардыю. Луку ён памятае яшчэ маладым, дваццаці адовым. А потым больш сустрэцца не давялося.

Партызанскі сувязны ў гэтую вайну, Кірыла Урбан расказаў мне аб адной з буйнейшых аперацый партызан — узрыве моста праз рэчку Дрысу. Гэта было ўлетку сорак другога года, калі нашы войскі вялі цяжкія абарончыя баі, — і партызаны на два тыдні вывелі чыгунку са строю.

«...не пакідайце ворагу нічога. Разбірайце пуці... Узрывайце масты», — так раіў паступаць Уладзімір Ільіч Ленін у сваім адказе на тэлеграму з Дрысы.

У безлічы спраў, у найцяжэйшыя дні маладой Савецкай рэспублікі, дні, калі вырашаўся лёс — быць альбо не быць нашай краіне, Уладзімір Ільіч знайшоў час адказаць:

«Старшыні дрысенскага саўдэпа урбану аказвайце супраціўленне там дзе магчыма кропка вывозьце ўсё каштоўнае і прадукты кропка астатняе знішчайце кропка не пакідайце ворагу нічога кропка разбірайце пуці — дзве вярсты на кожныя дзесяць кропка узрывайце масты Ленін».

Ну вось і ўсё аб маёй сустрэчы з Урбанамі з калгаса імя Леніна Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці — пра іх здымаецца фільм.

І. ПІСЬМЕННАЯ, спец. кар. «Літаратуры і мастацтва».

ПІСЬМЕННІК ЗА РАБОЧЫМ СТАЛОМ

АБ ЧЫСЦІНІ І МОЦЫ НАРОДНАЙ

БЫВАЕ Ж ТАК: прыходзіць чалавек у літаратуру, плённа працуе ў ёй, выдае кнігу за кнігай, якія ўвогуле прыхільна сустракае чытач і літаратурная грамадскасць, аднак доўгі час, выпадкам — цэлыя гады, праца пісьменніка ацэньваецца чамусьці аднабакова, творы яго ўспрымаюцца пад якімсьці адным, аднойчы некім усталяваным пунктам гледжання. Але вось з'яўляецца новая кніга пісьменніка і яна неяк раптоўна прымушае і чытачоў, і крытыкаў зірнуць на пісьменніка інакш, убачыць яго сапраўдную творчую сутнасць, кніга, якая хоць і не адмаўляе цалкам (такое наўрад ці магчыма) ранейшыя ўяўленні аб яе творцы, аднак істотна іх пераіначвае.

Нешта падобнае, мне здаецца, было ў свой час з вядомым і прызнаным сёння нашым празаікам Аляксеем Кулакоўскім. З першых жа ягоных твораў нехта, можа і без злога ўмыслу, назваў пісьменніка бытапісцам.

Але вось у 1956 годзе з'явілася яго аповесць «Нявестка». Твор адразу ж здабыў сабе шырокую папулярнасць у чытача, аповесць лягла ў аснову кінафільма «Шчасце трэба берагчы». Крытыка таксама была адзінадушнай — «Нявестку» называлі ў ліку лепшых твораў пасляваеннай беларускай літаратуры. Папрокі ў бытавізме адпалі самі сабой.

Што ж здарылася? Можа, А. Кулакоўскі адмовіўся ад сваіх ранейшых прынцыпаў, перастаў быць «бытавіком»? Не, якраз наадварот. Менавіта ў «Нявестцы» найбольш поўна праявіліся тыя якасці пісьменніка, якія былі прыкметны ў першых яго апавяданнях (чым, дарэчы, гэтыя апавяданні і вылучаліся) — прыхільнасць яго да бытапісання і паглыбленага псіхалагізму. Аказалася, што на бытавым матэрыяле пісьменнік расчыняе акно ў шырокі свет чалавечага жыцця з яго самымі рознымі (маральна-этычнымі, грамадска-сацыяльнымі, філасофска-палітычнымі) праблемамі і пытаннямі, імкнецца раскрыць псіхалогію чалавека (нашага сучасніка) у самых розных аспектах яе праяўлення. І ў гэтым імкненні ўвага пісьменніка да бытавой дэталі — яго добры саюзнік і памочнік. Бытавая дасведчанасць — адна з моцных якасцей таленту празаіка.

Апошнія творы А. Кулакоўскага, у прыватнасці, зборнік апавяданняў «Першае чаканне», аповесці «Твой шлях перад табою», «Тры зоркі», «Расце мята пад акном», раман «Сустрэчы на ростанях» (усе яны добра вядомы нашаму чытачу), засведчылі, што майстэрства пісьменніка расце, што талент яго дужэе, а творчыя інтарэсы пашыраюцца. Але яго пісьменніцкая пазіцыя застаецца ранейшай — схільнасць да бытапісання і да добрага псіхалагізму, як нязменнай застаецца галоўная тэма яго і задача — паказ таго, як ва ўмовах савецкай рэчаіснасці раскрываюцца, выяўляюцца магчымасці, закладзеныя ў простым чалавеку.

Думалася пра ўсё гэта, калі ішоў да А. Кулакоўскага — узяць невялікае інтэрв'ю аб тым, над чым ён працуе, чым заклапочаны сёння...

На стале ў пісьменніка — ладнаваты стосік лістоў. На верхнім з іх значыцца: «Сцежкі зведаныя і нязведаныя. Раман». Аляксей Мікалаевіч кладзе на рукапіс далонь:

— Прыемны воку і душы стосік машынапісу. Прыемны, бо закончана новая кніга. Ну, а пакуль гэты стосік з'явіўся на стале, прайшло больш як два гады. А два гады — немалы час. Ды каб жа толькі час стараў кнігі! Пра час мы гаворым таму, што яго ўсё ж заўважаеш, адзначаеш, вымяраеш — гадзінамі, днямі, гадамі. А чым вымераць тую душэўную энергію, якая заўсёды траціцца на кожную кнігу? Колькі было роздумаў, перажыванняў, пакут, сумненняў, бяссонных начэй? Не буду крывіць душой — нямала было за гады працы над кнігай і радасных, шчымліва-прыемных хвілін, калі адчувалася, нават верылася, што напісалася тое і так, як хацелася б...

Відаць, у кожнага сапраўднага творцы бывае, пасля сканчэння вялікай працы, вось такі настрой, калі на душы пануе трывожна-радасная лёгкасць, калі адчуванне здзейсненага (здзейсненага на адзіноце, сам-насам) штурхае выгаварыцца... Таму сяджу і моўчкі слухаю Аляксея Мікалаевіча...

— Усё гэта цяпер сконнылася, адышло ўбок да таго часу, пакуль не будзе пакладзены на стол новы, загатаваны раней сюжэт. У мяне — так. Пакуль не складзецца сюжэт, хоць бы яго стрыжань — за стол не саджуся. Ну, але гэта к слову. Дык вось, адно адышло, а другое... Пачаліся цяпер тыя душэўныя трывогі, якія выклікаюцца неадступным, назойлівым пытаннем — што ж усё-такі напісалася, ці выйшла тое, пра што думалася, ці такое яно, як жадалася? Ад гэтых пытанняў нікуды не дзенешся, хоць сам на іх і не адкажаш. На іх адкажуць чытачы, пісьменніцкая грамадскасць...

— Аляксей Мікалаевіч, гэта ўжо мусіць не сакрэт — пра што твор?

— От, от, так, звычайна, і пытаюцца: на якую тэму напісана: вясковую, калгасную ці гарадскую, рабочую, любоўную ці прыгодніцкую? Лягчэй таму аўтару, які можа проста адказаць: напісаў пра завод, пра новабудоўлю, пра каханне. Нічога такога я сказаць не магу. Зрэшты, гэта, мусіць, і не так важна. Сказаць, кніга пра вёску, — яшчэ нічога не сказаць. Думаецца, будзе лепш, калі паспрабаваць акрэсліць сутнасць твора.

Аляксей Мікалаевіч падняўся, прайшоўся па пакоі, потым зноў прысеў да стала:

— Пачну крыху здалёк. Відаць, кожнаму імпануе чалавек, які вылучаецца сярод іншых нейкімі прывабнымі рысамі. Такога чалавека адразу заўважаюць, з ім яшчэ здалёк вітаюцца сябры, пасылаюць услед ветлівыя ўсмешкі. Але ёсць людзі, знешне быццам нічым не прыкметныя. Ды і сваім грамадскім становішчам яны не прыцягваюць увагі. Яны могуць ціха, сціпла, памяркоўна пражыць свой век, і ніхто, акрамя родзічаў ды блізкіх суседзей, не будзе ведаць, якой цудоўнай душы, якога вялікага сэрца былі гэтыя людзі. Яны нідзе асабліва не паказваюць сябе і наогул не любяць што-небудзь рабіць на паказ. Яны можа нават і не ведаюць наперад, што могуць зрабіць, на што здатны. Але калі надарыцца, калі вымусяць абставіны, гэтыя людзі дзейнічаюць згодна са сваімі меркаваннямі і адчуваннямі, робяць, паводзяць сябе так, як падказвае ім уласнае сумленне, парыў душы. І ўчынкі і дзеянні іх, вялікія ці малыя, абавязкова будуць патрэбнымі, карыснымі, высакароднымі, бо інакш такія людзі і не могуць нічога рабіць.

Колькі такіх людзей у нашых гарадах і рабочых пасёлках, у мястэчках і вёсках! Звычайных савецкіх людзей, пра якіх мы, відаць, крыху крыўдліва і, пэўна, не зусім разумна гаворым — просты чалавек. Зусім ён не просты, просты савецкі чалавек. Зазірні ў яго душу і табе адкрыюцца шчодрыя запасы жыццёвай энергіі і моцы, сардэчнай, да цнатлівасці, чысціні, невычэрпныя крыніцы мудрасці.

Адкуль у іх, на першы погляд такіх звычайных людзей, такая маральная чысціня, высокая сумленнасць, душэўная прыгажосць і абаяльнасць? Дадзена ўсё гэта ад прыроды? Выхавана жыццём? Набыта ад людзей? Несумненна. Але несумненна і тое, што галоўнае тут—уплыў і ўздзеянне ўсяго лепшага, што ёсць у нашым народзе, у нашым сацыялістычным ладзе. Сумленная душа ўспрымае ўсё добрае ад свайго народа, ад нашага грамадскага ладу і трывала захоўвае гэтае добрае, беражэ яго, праносіць праз усе нягоды і выпрабаванні жыцця. Што б ні здарылася з такім чалавекам, якія цяжкасці і беды ні ўгатаваў бы яму лёс, ён заўсёды застанецца самім сабой, не прынізіць сваёй высокай чалавечай годнасці.

Вось пра такіх людзей мне і хацелася напісаць кнігу, якая цяпер атрымала назву «Сцежкі зведаныя і нязведаныя». Гэтая тэма —тэма чысціні, вернасці і моцы народнай, мне здаецца, галоўная тэма і ўсіх, бадай, ранейшых маіх кніжак.

І яшчэ што хочацца сказаць? Увесь наш народ, уся краіна рыхтуецца да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна. І можа быць таму, што кніга пісалася ў такі час, я асабліва шмат думаў пра тое, як прыходзіў селянін да Леніна, перачытваў ленінскія працы па сялянскім пытанні... Селянін душой адчуваў ленінскую праўду, ленінскія ідэі насіў у душы. Сёе-тое пра гэта паспрабаваў сказаць у рамане. У сувязі з гэтым хачу заўважыць, што мы часам вузка разумеем ленінскую тэму ў літаратуры і мастацтве. Наша жыццё, нашы дасягненні, новы чалавек, які вырас за гады Савецкай улады, — усё гэта, мне здаецца, ленінская тэма.

— Ці нельга крыху канкрэтней пра раман, Аляксей Мікалаевіч? Хто галоўны герой твора? У які час адбываюцца яго падзеі?

— Шчыра кажучы, падрабязна пра гэта гаварыць пакуль што не хацелася б. Спадзяюся, што раман неўзабаве выйдзе ў свет — ён будзе друкавацца ў «Полымі», і тады чытачы лёгка знойдуць адказы на ўсе пытанні. А калі коратка... У цэнтры твора — лёс Банэдыка Аднавочкі. Хто ён? Спачатку—беззямельны селянін, які вымушаны займацца рамяством. Скрыпач. Калгасны брыгадзір. Потым — партызанскі сувязны. Яшчэ пазней—баец партызанскага атрада. Час дзеяння — канец дваццатых, трыццатыя гады, пачатак саракавых. Месца дзеяння, часцей за ўсё, вёска... Як бачыш, гэтыя скупыя звесткі скажуць чытачу вельмі мала. А пераказваць раман... Лепш, калі чытач прачытае яго сам.

Успомнілася тое, аб чым думаў, калі ішоў да пісьменніка. Рашыўся спытацца:

— А як наконт «быту» і «бытавіка»?

Аляксей Мікалаевіч усміхаецца:

— Ведаю, ведаю. Мяне некаторыя называюць «бытавікам». Справа не ў слове, а ў тым, што разумець за ім. Корпанне ў дробязях быту — гэта адно. Бытавая, ёмістая і трапная, дэталь—другое. Я ўжо не аднойчы казаў і магу паўтарыць, што па-мастацку важная дэталь нясе ў сабе вялікі змест. Я люблю такую дэталь. І ў гэтым сэнсе я, мусіць, сапраўды «бытавік». Застаюся ім і ў новай кнізе.

На развітанне Аляксей Мікалаевіч адгукаецца на просьбу прапануе ўвазе чытачоў «Літаратуры і мастацтва» раздзел з толькі што скончанага рамана «Сцежкі зведаныя і нязведаныя».

Мікола ГІЛЬ.

Аляксей Кулакоўскі

ШЧАСЛІВЫЯ ВЕЧАРЫНКІ

РАЗДЗЕЛ З РАМАНА

Іван-Паўлік і Аркадзь Квас чакалі Банэдыка ноччу ў Маневе. Ужо выйшаў час, а старога не было. Апярэдзілі паліцаі? Гэта магло быць, таму і брала хлопцаў трывога.

Клім даручыў прывесці ў атрад Банэдыка і загад свой аддаваў такім тонам, што ўжо нават тады нельга было не затрывожыцца. Страціўшы давер да сына, які (цяпер гэта ўжо было вядома) не здолеў больш жыць здрадзікам, фашысты маглі расправіцца і з бацькам.

— Ты быў у яго?—прыдзірліва спытаў Аркадзь у Івана-Паўліка.

— А як жа!—Хлапец нават здзівіўся, што пачуў такое пытанне: што б яму ні даручалі, ён заўсёды выконваў з найлепшай дакладнасцю.

— Бычыха дома была?

— Была, — смела гледзячы Аркадзю ў вочы, адказаў малы.—Але я дачакаўся, калі яна з нейкім мяшком на плячах пасунулася з хаты, а тады зайшоў...

Іван-Паўлік быў у Банэдыка,—гэта праўда. І стары ведаў, што ў сённяшнюю поўнач яму трэба быць у Маневе. Але выйсці і з хаты, і з вёскі трэба было непрыкметна. Паціху збіраючыся, ён прыкідваў, што трэба было б узяць з сабою, але, як на тое зло, па хаце ўвесь час сноўдалася Бычыха і напэўна сачыла за ім. Нарэшце ўдалося вырвацца толькі з акрайчыкам хлеба ў запазусе.

...Каля таго месца, дзе была Лявонава хата, самі ногі спыніліся, хоць стаяць ужо і не было часу: Банэдык адчуваў, што хлопцы ідуць насустрач, а можа прыйшлі на месца і чакаюць.

Няхай трошкі пачакаюць...

Лявона падпільнавалі, калі ён вярнуўся з лесу, і забралі ноччу,—Банэдык некалькі дзён не ведаў пра гэта...

У апошнюю хвіліну ягонага жыцця, калі старога паставілі на прынесены Панцем услончык, Банэдык, ідучы на ўсякую рызыку, падаўся наперад, стаў ківаць яму галавой. Але стары лекар быццам бы не заўважаў гэтага, хоць і глядзеў свайму сябру проста ў твар і напэўна бачыў слёзы на прыплюснутых старэчых вачах.

...Попел Лявонавай хаты ўжо ўлёгся, амаль зраўняўся з зямлёю, толькі печ, нібы вечны помнік добраму чалавеку, узвышалася над папялішчам. Банэдык зняў сваю шапку-абвісуху,—засвяцілася ў цмеры лысая галава з белым парадзелым венчыкам валасоў. Пакланіўся папялішчу, печы-помніку і, трымаючы шапку ў руцэ, пайшоў далей.

...Вісельня. Яна яшчэ стаяла. Вераўчаная пятля вісела на ёй і матлялася, нібы намерваючыся захапіць яшчэ каго-небудзь за шыю. Гэтая пятля адправіла на той свет Лявона, чалавека, які за ўсё сваё жыццё не толькі якой-небудзь справай, а нават словам не пакрыўдзіў нікога. Невядома, хто ўмацаваў на перакладзіне гэтую пятлю, а вісельню зрабіў Панця. Пра гэта Банэдык ведаў. Маці падказала, як трэба рабіць вісельню. Пра гэта таксама Банэдык ведаў.

І вось апошняе ад вёскі—капліца, таполя. Банэдыку хацелася спыніцца і каля іх: амаль чвэрць веку пражылося ў Арабінаўцы, куды ні ішлося, куды ні ехалася за гэтыя гады,—таполя і капліца заўсёды нібы праводзілі ў дарогу. Потым былі вяртанні і самымі першымі віталі зварот зноў жа—таполя і капліца: адна—здалёк, другая—зблізку...

Але як пастаіш тут, калі побач вісельня? І пятля матляецца нібыта ўсё мацней і мацней...

Усё засталося за плячыма... Чаго шкада, чаго—не? Банэдыку здаецца, што ўсяго цяпер шкада, акрамя хіба толькі Бычыхі, якая не прынесла яму шчасця. Але і яна не заўсёды наўмысна рабіла нядобрае...

Шкада скрыпкі. Да чаго яна там далежыцца на палатках, чаго і каго дачакаецца?.. Бычыха прадасць яе або прамяняе, як і нябожчык Панця, калі толькі трапіцца зручны выпадак... Хораша заспявалі струны, калі вунь тады, пры першым ачуванні, Банэдык крануў іх пальцамі. Пазналі яны старыя пальцы гаспадара і можа нават адчулі, што ўжо не хутка дачакаюцца іхняй, такой звычнай, жаданай ласкі. А можа і зусім не дачакаюцца, таму і заспявалі гэтак шчыра, ад усёй душы.

Стары музыка і цяпер чуе гэтую апошнюю струнную песню... Яна хораша ласціць слых, наводзіць на ўспаміны... Няўжо яна развітальная і нібы хаўтурная?.. Не! Вось і нешта вясёлае ў ёй, маладое... Вось быццам і той вальс, што вітаў па гэтых струнах некалі ў маладосці. Ён лепш за ўсё выяўляў настрой, адкрываў душу, паказваў гарачае пульсаванне сэрца...

Не кожны раз гэта было і не перад кожным чалавекам. І зусім, зусім не на кожнай вечарынцы!..

Былі і ў яго шчаслівыя, незабыўныя гадзіны. Былі такія вечарынкі, калі на іх прыходзіла... яна. Не, гэта не Бычыха, і ніякая іншая з тых, што сустракаліся потым. Гэта была адна-адзіная, першая і апошняя...

Яна не падыходзіла да Банэдыка, калі ціха і амаль некрыкметна з'яўлялася на вечарынцы, яна не чакала, што ён падыдзе да яе і запросіць на танец, бо хто ж тады будзе іграць? Ніхто нават і не здагадваўся аб іхняй таямнічай блізкасці...

(Заканчэнне на 4-й стар.).

Малюнкі мастака В. Тарасава да кнігі М. Герчыка «Сонечны круг», якая рыхтуецца да здачы ў друк у выдавецтве «Беларусь».

НАТХНЕННЕ.

Фотаэцюд В. ДУБІНКІ.

СТВАРАЕЦЦА НОВАЯ ПРАГРАМА

НАТАТКІ З КАНЦЭРТА АНСАМБЛЯ ПЕСНІ І ТАНЦА ЧБВА

УРАЧЫСТЫЯ фанфары, якія прагучалі яшчэ пры закрытай заслоне, абвясцілі аб пачатку канцэрта Ансамбля песні і танца Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі. Упершыню давалася праграма, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

Песня Б. Аляксандрава «Партыю Леніна славіць народ» настройвае залу на ўрачысты лад. Атмасфера свята захапіла ўсіх прысутных і захоўвалася на працягу амаль усяго канцэрта. Пачалася вакальна-харэаграфічная кампазіцыя.

...На імгненне пагаслі агні на сцэне, і вось у святле чырвоных пражэктараў матросы спяваюць песню «У ноч на 26-е» («Штурм Зімняга»), створаную Д. Фалілеевым на словы Я. Бялінскага. Строга і ўзнёсла гучыць мужчынскі хор, і ва ўяўленні слухачоў прадстаюць карціны той, кастрычніцкай ночы 1917-га, якая павярнула ход гісторыі...

На сцэне — эпізод з часоў грамадзянскай вайны, поўны гераічнай рамантыкі і светлага лірызму. Ідзе інсцэніроўка песні Д. Пакраса «Камсамольская развітальная». Песню падхопліваюць чырвонаармейцы ў будзёнаўках, твары іх поўныя волі і рашучасці ісці ў бой за ўладу Саветаў.

Песня А. Пашкевіча «Стэпамстэпам» на словы М. Нягоды (саліст Г. Макоўскі) — як працяг гэтага ўсхваляванага мастацкага расказа аб барацьбе народа за свабоду і шчасце. Гэта памяць аб тых, хто загінуў у барацьбе і ніколі не вернецца дадому. Савецкія салдаты пампажаюць традыцыі герояў, заўсёды ў страі—і ў гады вялікіх бітваў і ў мірныя будні. Яны—на варце заваёў народа. Гэтая думка яркa гучыць у песні-маршы К. Малчанава на словы Ю. Камянецкага «Салдаты, вы заўсёды ў страі».

«Сустрэча пераможцаў» — так называецца танцавальная сцэна, якая завяршае кампазіцыю. Гэта свята народаў краіны. Танцуюць беларусы, рускія, украінцы, грузіны... Яркі і святочны гэты танец добра ўпісваецца ў праграму.

Усе нумары вакальна-харэаграфічнай кампазіцыі звязаны адзіным літаратурным стрыжнем, які робіць яе развіццё лагічна паслядоўным і пераканаўчым. Праграму канцэрта вядзе саліст ансамбля заслужаны артыст БССР Б. Макараў. Кампазіцыя цікава вырашана рэжысёрам (пастаноўшчык — мастацкі кіраўнік ансамбля, заслужаны артыст РСФСР Д. Фалілееў).

А далей праграма канцэрта будуецца па прынцыпу чаргавання асобных ансамблевых і сольных нумароў. Сярод іх ёсць і менш цікавыя нумары як па музычным матэрыяле, так і па выкананні. Затое агульнае ўражанне застаецца яркае і хвалюючае.

Шырока гучыць руская народная песня «Слаўнае мора — свяшчэнны Байкал» (саліст А. Ларчанкаў). Услед за ёй — «Расіяначка» на музыку Б. Краўчанкі, песня, на першы погляд, кідкая, але па сутнасці — просценькая ў сваёй мелодычнай аснове.

Тэмпераментная венгерская народная песня «Ты быццам ружа» выконваецца хорам лёгка і весела (саліст — заслужаны артыст БССР Г. Светашаў). «Помні, таварыш» А. Унукава—літаратурна-музычная кампазіцыя, якую мякка, у лірыка-споведальнай манеры выконвае Б. Макараў. І, нарэшце, украінскі танец — гарачы, віхурны, у якім ярка выяўляецца майстэрства і тэмперамент удзельнікаў танцавальнай групы ансамбля (балетмайстэр В. Кузняцоў, салісты А. Краліна і А. Барадаўкін).

Першае аддзяленне закончылася. Вельмі ўражвае яго пачатак, вакальна-харэаграфічная кампазіцыя, якая арганічна адпавядае тэме канцэрта. З другога боку застаецца пачуццё незадавальнення фіналам, які разбурае настрой, народжаны ў пачатку, рамантычна-прыўзнятую атмасферу, і прызямляе тэму. Відаць, кіраўніку ансамбля і выканаўцам варта падумаць аб тым, каб цэласная па змесце кампазіцыя заняла ўсё першае аддзяленне канцэрта і з'явілася б музычна і літаратурна завершаным палатном. Усе астатнія нумары змаглі б перайсці ў праграму другога аддзялення.

Добра, што салісты і ўвесь ансамбль выканаўцаў дзейнічаюць на сцэне зацікаўлена, з пачуццём адказнасці перад слухачамі і гледачамі. Гэта таксама дадатная якасць канцэрта. Праўда, калектыву армейскіх артыстаў трэба больш строга адбіраць нумары для сваіх праграм. Хай яны дамагаюцца, каб тэматычная змястоўнасць канцэрта была суладнай з эстэтычным харастваом ва ўсіх мастацкіх вымярэннях. Навошта ім звяртацца да твораў, якія толькі павялічваюць колькасць нумароў і не могуць садзейнічаць развіццю густу аўдыторыі?

Ансамбль, хоць часам і дазваляў сабе выконваць, паўтараю, творы, наўрад ці вартыя яго таленту і прызначэнню, здолеў надаць канцэрту першым аддзяленнем святочны настрой, увёў нас у свет цікавай і змястоўнай музыкі, палымяна імклівых танцавальных рытмаў. Насцярожыла мяне адно — чамусьці ў рэпертуары не было ніводнага твора беларускіх кампазітараў. Цярпліва пачакала другога аддзялення: спадзявалася, што ансамбль нешта «прызапасіў» новае і нечаканае...

Пачалося другое — і, шчыра кажучы, той настрой, аб якім я гаварыла вышэй, аднавіўся толькі ў фінале.

Салдацкая песня «Самавары-самапалы» А. Новікава прагучала ў хора лёгка і весела, хоць салісты І. Гарбушын і А. Ларчанкаў маглі б быць больш гарэзлівымі, менш «сур'ёзнымі». Прыемнай нечаканасцю было выкананне хорам (салісты У. Рыбачук і А. Бажылін) своеасаблівай жартоўнай песні Г. Партнова «Няньчын марш» (салдацкая калыханка). Салдацкая лірыка была прадстаўлена песняй «Ля далёкай ваколіцы» В. Аляксеева, якую хор праспяваў акапэльна, і славутай песняй ваенных гадоў «Цёмная ноч» М. Багаслоўскага (саліраваў Г. Светашаў). Апошняя пакінула асабліва моцнае ўражанне глыбінёй раскрыцця пачуцця. У акапэльным спяванні не заўсёды была чыстая інтанацыя — гэта яўны недахоп.

Рускі танец і фінальная песня «Чырванасцяжная БВА» (музыка хормайстра ансамбля Я. Яравога) завяршылі праграму...

Я спецыяльна пакінула размову аб пачатку другога аддзялення канцэрта пад канец сваіх нататак. Было нечакана і нават крыўдна раптам убачыць, як выдатны армейскі калектыў, са сваім выканаўчым аблічам, сваёй манерай падачы нумароў, ў гэтым аддзяленні ператварыўся ў звычайны эстрадны ансамбль. Такія ансамблі мы сустракаем у любым эстрадным канцэрце, яны падобныя адзін на адзін як выканаўчай манерай, так і рэпертуарам. У гэтым выпадку, праўда, рэпертуар быў для нас новы. Аднак заўважу, што песня «Камісары» Зарыцкага і Кукліна бляклая па музычнай мове, а песня «Горад наш родны» Я. Яравога, прысвечаная Мінску, аказалася банальнай песенькай, вытрыманай у традыцыйным эстрадным рытме, які надакучыў нават яго прыхільнікам.

«Эстрадную частку» канцэрта не выратавалі ні выступленне ансамбля скрыпачоў — раманс Д. Шастаковіча з музыкі да кінафільма «Авадзень» і «Вечны рух» К. Бома былі выкананы сур'ёзна, з пачуццём адказнасці, хоць і без дастатковага мастацкага эфекту, — ні пластычны эцюд (М. Лёганькі працуе ўпэўнена, пераадольваючы вялікія цяжкасці), ні «Гранада» ў выкананні Г. Светашава, ні нават «Танцавальная прагулка» (танец у рытмах леткі-енькі жаночая група танцавала лёгка і зграбна). Проста не трэба было, відаць, гэту сур'ёзную праграму, якая сама па сабе можа разлічваць на поспех у слухачоў, «разбаўляць» чужародным ансамблю «эстрадным рэверансам». Ён не даў калектыву ніякага выйгрышу — ні рэпертуарнага, ні выканаўчага.

Адзначаючы ўзросшае майстэрства ансамбля — дастаткова сакавіта, моцна гучыць хор, удасканальваецца майстэрства танцавальнай групы, свежа і зладжана гучыць аркестр, — трэба сказаць аб агульнай тэндэнцыі ў выбары рэпертуару. Ансамбль ЧБВА неяк абыякава паставіўся ў новай праграме да беларускага нацыянальнага рэпертуару. Ніводнай беларускай песні, ніводнага беларускага танца! Толькі ў танцавальным малюнку «Сустрэча пераможцаў» (чамусьці пасярод рытмаў леткі-енькі) прамільгнуў матыў з беларускай народнай музыкі. У кампазітараў Беларусі ёсць нямала добрых песень, якія маглі б заняць месца ў новай канцэртнай праграме ансамбля. А ўжо пра народныя песенныя і танцавальныя багацці Беларусі і напамінаць не трэба — імі такая поўная беларуская зямля!..

Ствараецца новая канцэртная праграма. Працэс гэты — творчы. Тут магчымы і пралікі, пра частку з якіх я і паспрабавала сказаць.

Алена РАКАВА.

МОЙ ЛЮБІМЫ ЖАНР—ТРАГІКАМЕДЫЯ

«Камедыя аб Ікрэмасе» — так называецца карціна, якую завяршае на «Масфільме» рэжысёр Аляксандр Міта. У галоўнай ролі здымаецца акцёр тэатра «Сучаснік» Алег Табакоў. Ён дзеліцца сваімі думкамі аб новай рабоце.

У кінематограф я вярнуўся пасля двухгадовага перапынку. Гэтая акалічнасць, безумоўна, мае сэнс. Я нясу ў фільм менш выпрабаваных прыёмаў, менш знойдзенага, прывычнага. А для мяне зараз гэта асабліва важна. Роля складаная, незвычайная, асаблівая. Яна патрабуе не рэалізацыі вопыту, што атрыманы ў тэатры, а новых акцёрскіх фарбаў, я б сказаў новай акцёрскай якасці. Таму, напэўна, не пакідае адчуванне, быццам пачынаеш усё спачатку.

За апошнія два гады я сыграў у тэатры некалькі новых роляў. Удалых, і не зусім. Сярод удалых ёсць вобразы, якія мне асабліва цікавыя. Па жанру, выкарыстанню сродкаў выяўлення яны блізкія трагікамічным вобразам. Гэта — брацец Лейман з «Балады аб невясёлым кабачку», Татарын у «На дне». Яны цікавыя сваёй дыялектыкай, парадаксальнай логікай. Гэтыя асаблівасці характэрны для некаторых работ Інакенція Смактуноўскага, Ралана Быкава, у некаторай ступені яны ўласцівыя і майму Алегу ў «Шумным дне».

Трагікамедыя — мой любімы жанр.

У арбіту свайго ўздзеяння яна здольная ўцягнуць велізарную колькасць гледачоў. Я думаю, — больш, чым трагедыя або псіхалагічная драма. Апрача таго, трагікамічны жанр больш, чым які-небудзь іншы, выяўляе вартасці і недахопы выканання. Акцёрскія здольнасці і магчымасці праяўляюцца ў ім у поўнай меры.

Усё гэта пацвярджае мой уласны вопыт. Усё гэта можна аднесці і да карціны «Камедыя аб Ікрэмасе», якую ставіць Аляксандр Міта. Ікрэмас — гэта імя галоўнага героя. Яно складзена з першых складоў слоў «Искусство — Революционным Массам». Герой быў акцёрам і назваў сябе гэтым імем таму, што марыў стварыць рэвалюцыйны тэатр. Вакол ішла грамадзянская вайна, а ў маленькім гарадку нараджалася новае, сапраўды народнае, рэвалюцыйнае мастацтва...

«Камедыя аб Ікрэмасе» — цікавы эксперымент. У ржысёрскай задуме я бачу імкненне стварыць псіхалагічны партрэт героя рэзкімі гратэскавымі трагіфарснымі фарбамі. Мы назіраем чалавека з надзвычай рухомай псіхікай, з бясконцымі перападамі настрояў, нечаканымі пераходамі ад смеху да слёз. Але яго паводзіны не ператвараюцца ў самамэту. Аб'ёмнае даследаванне чалавечага характару, яго асаблівасцей, абумоўленых рознымі акалічнасцямі, часам — вось што галоўнае.

Мне цікавы і блізкі мой герой. Чалавек на перагібе характару, чалавек, які жыве на мяжы сваіх магчымасцей, знаходзіцца ў крайняй ступені пераадолення жыццёвых і маральных перашкод. Мастак, станаўленне яго духоўнага свету. Мастак і рэвалюцыя. Мастак і грамадства. Такі арганізуючы лад гэтага фільма.

Пакуты наогул — рэч жорсткая, бесчалавечная, бессэнсоўная. Толькі пакуты мастака апраўданы, бо ён сваім талентам, творчасцю, жыццёвым вопытам можа дапамагчы іншым людзям. Аб гэтым фільм. Аб тым, як праз пакуты мастак прыходзіць да дабра, як жыццё людзей становіцца яго жыццём, а рэвалюцыя яго справай. Аб адкрыцці сябе, аб немагчымасці не тварыць, не працаваць.

Аб тым, як чалавек фанатычна любіць справу, якой займаецца,— аб усім гэтым хочацца расказаць гледачам. Не лагічна, разумна, а эмацыянальна. А пытанне аб тым, як іграць — для мяне не стаіць. Калі можаш імправізаваць свабодна, парадаксальна, не парушаючы пры гэтым ржысёрскай канвы,— значыць ты маеш рацыю і ўсё ідзе добра. Калі не — ты памыліўся, шукай іншага шляху. Шчаслівы лёс звёў мяне з Аляксандрам Міта. Працуем мы з ім у вялікай дружбе, радасна і цікава. Ніякіх сутыкненняў, рознагалоссяў. Няма двух пунктаў гледжання. Есць адзін, агульны, адзіны.

Канечне, зараз цяжка сказаць дакладна, якім будзе фільм. Але мы ведаем, якім мы яго хочам бачыць — фільмам мужнай праўды.

(АДН).

ШЧАСЛІВЫЯ ВЕЧАРЫНКІ

[Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.]

Калі яна з'яўлялася на вечарынцы і на нейкі час спынялася на парозе, нібы для таго, каб паказацца, нібы—каб агледзець, хто там ёсць, вочы іх сустракаліся, і не толькі ўсё ў хаце, а ўвесь свет для музыкі пераіначваўся. Наступным танцам ішоў той чароўны вальс. Ён нарадзіўся быццам бы міжвольна, але неяк вельмі лёгка, вось на такіх жа вечарынках, дзе была яна. І цяпер Банэдык не памятае, ці ён недзе трохі чуў штосьці падобнае, ці ўся мелодыя была створана ў тыя часы ім самім?

Ён ні разу не сказаў дзяўчыне пра сваё каханне, а ўсё насіў і насіў сваё вялікае пачуццё ў душы. І, мабыць, пэўная доля гэтага пачуцця праявілася потым у вальсе. Сапраўды, толькі доля, бо ўсю сілу і шчырасць свайго кахання ён не мог выразіць нават у гэтым найбольш блізкім сэрцу вальсе.

У часы такіх шчаслівых вечарынак Банэдык пачынаў іграць без нічыйго заказу. Ён наогул не любіў заказаў, бо не лічыў сябе нанятым. Страшэнна не цярпеў прымушэнняў іграць маршы пры сустрэчах або провадах іздрашоўцаў ці каго-небудзь іншага ды атрымоўваць за гэта пятакі. Нават і на вяселлях стараўся пазбягаць гэтага.

Яна ведала, што вальс пачынаўся для яе. Ведала таксама, чаму музыка іграе вось гэты вальс, хоць умее яшчэ некалькі. І зноў спыняла на ім свой уважлівы і поўны ўдзячнасці погляд. Тады ішла танцаваць, калі траплялася на густу напарніца. А не траплялася, то стаяла і слухала, бо не магла ж пайсці ў пары з самім музыкантам.

Здаралася, што спачатку трошкі ёкала ў сэрцы музыканта, калі не напарніца, а напарнік браў яе за руку, а яна клала сваю далонь яму на плячо. Потым зноў бачыў каля сябе яе вочы, блакітныя, на дзіва выразныя і светлыя. Яна і ў танцы глядзела на яго, і вальс ліўся сам сабою: ні рукі, ні гарачы ад прыемнай узбуджанасці падбародак не адчувалі скрыпкі, здавалася, што сама душа спявала і падавала свае пачуцці і свой рытм толькі ёй адной, хоць на танец выходзіла многа пар. Міжвольна наплывалі ўяўленні, што гэта не выпадковы напарнік кружыцца з ёю і смела трымае руку на яе таліі, а ён сам лёгка і плаўна выйшаў на круг і лунае па ім разам з ёю, пяшчотнаю і бясконца блізкаю...

...Чуе Банэдык сваю скрыпку і крочыць пад такт гэтай музыкі. Потым у голас скрыпкі нечакана ўліваюцца далёкія і чымсьці вельмі знаёмыя і блізкія сэрцу гукі звычайнай самаробнай дудкі. Некалі сам ён рабіў такія дудкі...

Жадаючы хоць чым-небудзь забавіць малога Панцю, ён выбіраў тыя шчаслівыя гадзіны, калі хлопчык не быў хворы або прынявечаны ад свае палазучасці, і вёў яго ў Манева. Вось гэтай дарогай, вось гэтай сцежкай, па якой ідзе цяпер сам. Між кустоў ядлоўцу і алешніку яны шукалі маладую рослую хваінку з вялікімі, гладкімі прагонамі за мінулыя гады. У Банэдыка амаль заўсёды быў у кішэні вялікі складны нож. Выбраўшы паміж смалістых і калючых венчыкаў галля такі прагончык, які ўжо сваім прыродным выглядам нагадваў дудку, Банэдык нагінаў хваінку і, хоць вельмі шкада было дрэўца, рабіў умелы надрэз, каб вызначыць, які там стрыжань, ці можа ён лёгка, не зламаўшыся, выкруціцца са светлай абалонькі.

Выпрабоўваць гэтак даводзілася часам і не адну хваінку, а некалькі. Затое, калі траплялася такая, што адпавядала ўсім патрабаванням музыкі, трубачка выкручвалася хутка, нібы хвойка сама аддавала свой лепшы гадавы наростак, сама жадала ператварыцца ў галасістую дудку.

Але сырая трубка яшчэ не дудка. Зняўшы кару, Банэдык нёс яе дадому і падсушваў на сонцы або на печы. Калі ж Панця хацеў пайграць тут, у Маневе, а то і пасвістаць, як лясныя птушкі, дык бацька рабіў яму свісцюльку з альховай кары. Такіх можна было нарабіць колькі хочаш, бо маладога алешніку было тут многа. Выходзілі дудкі розных памераў і з рознымі галасамі. Малы свістаў на іх, і яго лапехаваты рот жаўцеў ад гэтага і рабіўся падобным на яго ж суравыя штаны, пафарбаваныя альховай карою.

...Ад успамінаў заныла, зашчымела пад грудзьмі. Ужо недалёка і Манева, яно, хоць і марудна, але набліжалася, а могілкі, дзе ляжыць цяпер сын, быццам бы нехаця, пад нейкім неадольным прымусам, аддаляліся: ад капліцы да іх было—рукой падаць. Не быў стары на могілках у час пахавання, не наведаўся і пасля. А вось сёння, калі адыходзіў ад капліцы, нешта змрочнае і падсвядомае пацягнула яго туды. Адтуль плыў ветрык, быццам нёс начную мяккасць і вільгаць. Здалося, што і пах бярозавага гаю данёсся з гэтым ветрам.

Бярозы растуць на могілках. Твар павярнуўся на гэты пах і адразу знікла ўяўленне, што там бярозы, такія ж бела-зялёныя, плакучыя, як і ўсюды ў лесе. Перад вачыма паўсталі магілы: адна пры адной, адна пры адной...

Плошча пад могілкі не павялічвалася можа нават ад таго самага цара-гароха, а хаваюць там сваіх нябожчыкаў некалькі акаляючых вёсак. Як жа знойдзеш цяпер тую непрыкметную магілу? Чуткі пайшлі па Арабінаўцы, што сын пахаваны побач з Сушчэвічам. А дзе той Сушчэвіч? Банэдык ніколі не бачыў гэтага месца. Пазнаць свайго па свежай магіле? Дык там можа быць не адна такая...

Пераадолела цяга да Манева не толькі па гэтай прычыне. Калі б спыталі пра яе ў Банэдыка, то можа ён і не здолеў бы акрэсліць яе словамі. Панця—сын. Ад гэтага не адыдзеш, гэтага не вырвеш з душы. Панця часоў свісцюлек—самая дарагая радасць у жыцці. Пазней гэтая радасць часамі перабівалася прыхаванымі ды горкімі мужчынскімі слязамі. У апошнія гады—асабліва.

Але вось і Манева. З першых кустоў насустрач выскачыў Іван-Паўлік. Добра, што цёмна — не відно было вачэй гэтага падлетка. А калі наведваўся ён некалі да Лявона з даручэннямі ад бацькі, калі быў у Банэдыкавай хаце вось і апошні раз, то глядзеў на гаспадара з такім здзіўленнем і недаверлівасцю, што ў старога аж душа пераварочвалася ад такога погляду. Напэўна, не мог хлапец уразумець, як гэта, каб у сына-паліцая ды быў такі бацька, што яму нават у атрадзе давяраюць?

Прайшлі трохі кустамі, а там іх сустрэў Аркадзь Квас, з аўтаматам на жываце, з гранатамі на папрузе. Банэдык ледзь пазнаў яго, а калі пазнаў, то чамусьці падумаў у першую хвіліну, што хлопца, відаць, наўмысля прыслалі сюды, каб напомніць аб мінулым і растрывожыць рану, якая і так не гоіцца і, напэўна, ніколі не загоіцца.

Гаварыць з Аркадзем было цяжка, нават балюча, хоць ніякай асабістай віны перад ім Банэдык не адчуваў. А хлопец шчыра цягнуўся да размовы: можа таму, што даўно не быў у роднай вёсцы, а можа ад пачуцця сіроцтва юнацкая душа хілілася да паважлівага суседа.

— Я тут ўспамінаў вас,—сказаў Аркадзь, падтрымліваючы Банэдыка пад локаць у тых мясцінах, дзе ўжо звыклае да начных паходаў малодшае вока заўважала на сцежцы ямку ці купіну.—Часта ўспамінаў.

«За што?»—пытаў сам у сябе Банэдык, а ўслых не гаварыў нічога.—За добрае, то можа і не было чаго ўспамінаць?»

— І дзякаваў вам,—гаварыў далей хлопец.—Каб не вы, то...

— Гэта самае!..—тут ужо не вытрымаў стары.—За што мне дзякаваць? Не давядзі божа ўспамінаць усяго таго...

— Усе мы загінулі б, каб не вы,—цвёрда сказаў Аркадзь.—І каб не дзед Лявон, нябожчык.

Пра Лявонавы справы можна было б і пагаварыць, прыемна пра іх і ўспомніць. Можа калі ўспомняцца і Банэдыкавы справы ў Арабінаўцы, але ў гэтыя хвіліны ніякая сіла не магла адцягнуць старога ад новых і, здавалася, яшчэ больш цяжкіх і балючых успамінаў пра сына. І зноў брала верх перакананне, што не трэба ісці на могілкі, і добра зрабіў, што не павярнуў тады ад капліцы.

— А дзе пахаваны дзед Лявон?—раптам спытаў Аркадзь.—Немцы дазволілі пахаваць яго?

— А мы ў іх не пыталіся,— адказаў Банэдык.—Ноччу таго ж дня знялі і пахавалі. Хораша пахавалі. На Забродскіх могілках.

Банэдык хацеў яшчэ дадаць, што магіла Лявона непадалёку ад магілы Квасіхі, Аркадзевай мацеры, ды не асмеліўся. Потым падумаў, што можа Аркадзь таму і пытаў пра Лявона, што хацеў нешта пачуць і пра сваю маці: магчыма, што да таго часу і не здолеў хлопец туды наведацца, а калі і наведаўся, то як мог пазнаць магілу мацеры, калі не быў на пахаванні?

«Схадзіць бы на могілкі нам абодвум,—раптам з'явілася ў старога думка.—Паказаў бы я хлопцу магілу яго мацеры, паказаў бы крыжык дзеда Лявона...»

А пра магілу Панці, канечне ж, Аркадзь не спытаў бы. І мабыць ніхто ніколі не спытае...

На світанні Кліму далажылі, што ў атрад прыйшоў Банэдык. Камандзір атрада наведаўся ў той буданчык, дзе хлопцы часова прытулілі старога, але ўбачыўшы, што Банэдык яшчэ спіць, спагадліва адышоў.

— Няхай адпачне,—сказаў дзяжурнаму па лагеры,—а калі прачнецца, прывядзі да мяне.

Новы партызан, на здзіўленне ўсім, не прачынаўся доўга. Потым сам сабе дзівіўся: няўжо лясны спакой так паспрыяў? А можа стомленасць і аслабленасць узялі сваё?

Гаворка з Клімам адбывалася ўжо на ходу, бо сядзець не было калі,—атрад выпраўляўся на вельмі важную аперацыю.

— Гэта пазнаеце?—спытаў Клім, падводзячы старога да гаспадарчага ўзвода.

Банэдык перш за ўсё пазнаў брыгаднага жарабка, якога яны з Клімам некалі адабралі ў Гнядзенькага. Прыгожы рысак стаяў ужо асядланы.

Потым ледзь не на кожным кроку стары заўважаў што-небудзь калгаснае, з яго брыгады: яшчэ некалькі коней, калёсы, нават вупраж.

— Гэта ўсё вашы клопаты,—сказаў камандзір атрада.

Банэдык пакруціў галавой:

— Я без Нічыпара... гэта самае... нічога не зрабіў бы. І без нябожчыка Лявона.

— А вунь!—паказаў Клім на мяшкі з мукою.

— А гэта Крутамыс. З дочкамі сваімі. Я толькі жыта ім даваў.

Ішлі далей і амаль усюды Банэдык сустракаў знаёмых і нават блізкіх яму людзей: то арабінаўцаў, то галубоўцаў, то іздрашоўцаў. Паступова знікала з душы адчуванне адзіноты і нейкай беззваротнай страты, прасвятлялася, хоць можа трохі і ўводзіла ў зман уяўленне аб партызанскім жыцці: тут нешта быццам бы нагадвала калгас і нават сваю Арабінаўку ў часы выездаў у поле.

У мяне там дома яшчэ... гэтае самае...,—прыўзнятым тонам загаварыў Банэдык.—Яшчэ адна схавань жыта засталася. Трэба б яе забраць сюды.

Да камандзіра ледзь не на галопе пад'ехаў коннік, падаў запіску. Клім спыніўся, прачытаў.

— Перадай, што зараз жа выступаем!—сказаў коратка, і на ходу стаў аддаваць распараджэнні ўжо больш рашуча і таропка.

— Хініч прыслаў,—растлумачыў Банэдыку.—Да вечара трэба заняць зыходныя пазіцыі.

Што гэта такое ў дакладнасці, Банэдык не зразумеў, бо ніколі не быў вайскавіком, аднак адчуў, што гэта ўжо зусім не калгасная справа: мабыць, набліжаецца нешта надзвычай грознае і небяспечнае.

У паходзе Клім зноў параўняўся з Банэдыкам.

— Тут я глядзеў, перабіраў,—быццам з нейкай вінаватасцю загаварыў ён,—якую б гэта вам зброю даць? Каб лягчэйшая была і спадручная. Дык можа вось гэта?—працягнуў карабін.

Банэдык спалохана адхіліўся, але ў той жа момант прыдавіў свае раптоўныя пачуцці і ахвотна, нават трохі падвыпрастаўшыся, прыняў зброю. Далонь левай рукі адчула гладкасць дрэўца. Нешта вельмі знаёмая, нават пяшчотная гладкасць, па ёй быццам бы сумавала левая рука. Гэта нібы шыйка скрыпкі...

Аж няёмка стала ад такога адчування і злосна на самога сябе.

«Панцеў гэта карабін ці не? Вельмі ж падобны. Можа Клім наўмысля так падладзіў, каб не забывалася цяжкае і прыкрае мінулае? Чутно было, што партызаны зноў нападалі на Галубоўскі гарнізон».

— Спытаеце тут хлопцаў, як тут з ім...—параіў Клім.—Патронаў таксама ў іх вазьміце.

Камандзір атрада імкліва падаўся ў галаву калоны, а Банэдык павёў леваю далоняю па варанёным жалезе карабіна. Хоць яно таксама было гладкае, але ўяўленне аб скрыпцы знікла адразу. Праваю рукою ён узяўся за раменную почапку і, як некалі сваю старую пістонаўку ўскінуў зброю на плячо...

ТЭЛЕБАЧАННЕ

4 лістапада

Першая праграма. 10.00 — навіны (М). 10.15 — «Маршрутамі пяцігодкі». «Маладосць старога завода». Перадача са Свярдлоўска. 10.45 — канцэрт лаўрэатаў Усесаюзнага фестывалю самадзейнага мастацтва. Выступаюць калектывы Куйбышаўскай вобласці (М). 11.45 — «Радасць творчасці». Да Усесаюзнай юбілейнай выстаўкі-конкурсу твораў самадзейных мастакоў дэкаратыўнага мастацтва. Перадача з Кіева. 16.55 — праграма перадач. 17.00 — навіны (М). 17.15 «Нашы інтэрвью». Выступленне супрацоўніка часопіса «Куба» Мануэля Поса. 17.30 — «Песні барацьбы і гневу». Гісторыя стварэння рэвалюцыйнай песні «Смело, товарищи, в ногу!» 17.50 — «Панарама навін» 18.00 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Выстаўка Бураціца» (М). 18.30 — ленінскі універсітэт мільёнаў. Гістарычны матэрыялізм «Этапы гістарычнага развіцця» (М). 19.00 — А. Крон. «Кандыдат партыі». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля. Перадача з Ленінграда. 20.30 — «Час». Інфармацыйная праграма. 21.15 — на атрыманне Дзяржаўнай прэміі БССР. Мастак Міхаіл Савіцкі. 21.50 — кінапанарама (М). 23.20 — навіны (М). 23.30 — для студэнтаў вну. «Вышэйшая матэматыка» 1 курс.

Другая праграма. 17.15 — «Аб'ектыў». Перадача для фотааматараў (М). 18.00 — у свеце мастацтваў. «Святаслаў Рыхтэр». Музычны фільм 19.00 — экран — заручнікам. Гісторыя КПСС. «XV з'езд ВКП(б). Курс на калектывізацыю сельскай гаспадаркі». 19.00 — экран паўторнага фільма «Апошняя ноч». Мастацкі фільм.

5 лістапада

Першая праграма 10.00 — навіны (М). У дні школьных канікул. 10.15 — «Бі, барабан!» Мастацкі фільм (М). 11.45 — для малодшых школьнікаў. «Свеціць зорачка». Перадача з Ташкента 12.15 — канцэрт харавой студыі «Піянеры» г. Жалезнадарожнага (М). 16.55 — праграма перадач 17.00 — навіны (М). 17.15 — для школьнікаў. «Рэха». Тэлевізійны часопіс. 17.55 — «Дзённік пяцігодкі». Расказ аб прапоўных палярунках Кастрычніку. 18.30 — «Па ленінскіх мясцінах». «У. І. Ленін у Польшчы». Тэлевізійны рэпартаж (М). 19.00 — «Коннікі рэвалюцыі». Мастацкі фільм (М). 20.40 — «Эстафета навін» (М) 21.25 — «Цырк у студыі» (М). 22.15 — «Панарама навін». 22.30 — «Музычная фільматэка». Эстрадная праграма. 23.25—навіны (М). 23.35 — для студэнтаў вну. «Начартальная геаметрыя».

Другая праграма. 17.15 — праграма калдоравага тэлебачання. П. Байлабура «Партрэт». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля. Перадача з Кіева. 18.00 — для школьнікаў. «Жаваранак». Музычная праграма (М). 20.40 — «Паэт». Мастацкі фільм. 22.15 — «Клуб аматараў песні» (М).

6 лістапада

Першая праграма 10.00 — навіны (М). 10.10 — «Па ленінскіх мясцінах». «У. І. Ленін у Польшчы». Тэлевізійны рэпартаж (М). 10.40 — у дні школьных канікул. «Армія Трасагузкі». Мастацкі фільм (М). 12.00 — «Час Радзімы» «Краіна перадсвяточная» (М). Уключэнне Мінска. 16.10 — праграма перадач. 16.15 — «Партызанскія сцягі». Рэпартаж з Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. 16.45 — навіны (М). 16.55 — урачыстае пасяджэнне, прысвечанае 52-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Святочны канцэрт (М). У перапынку — «Час» Інфармацыйная праграма (М). 20.30 — чэмпіянат СССР па футболу. ЦСКА—«Спартак» (М) 2-гі тайм (М). 21.15 — «Кастрычнік». Мастацкі фільм (М). 22.55 — «Час Радзімы». «Краіна перадсвяточная» (Паўтор дзённай перадачы) (М). 00 00 — навіны (М).

Другая праграма. 20.30 — для дзяцей «Гадзінік капітана Энрыка». Мастацкі фільм. 21.45—«Саюз раўнапраўных». Дакументальны фільм. 22.15 — «Песні 30-х гадоў». Фільм-канцэрт.

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ КАНСЕРВАТОРЫЯ імя А. В. ЛУНАЧАРСКАГА

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС

НА ЗАМЯШЧЭННЕ ВАКАНТНЫХ ПАСАД ПРАФЕСАРСКА-ВЫКЛАДЧЫЦКАГА СКЛАДУ ПА КАФЕДРАХ:

фартэпіяна — дацэнт 1
духавыя інструменты — прафесар (флейта) 1
камернага ансамбля і акампанемента:
старшы выкладчык — клас камернага ансамбля — 1.
выкладчык — клас камернага ансамбля — 1
выкладчык — канцэртмайстарскі клас — 1
асістэнт — канцэртмайстарскі клас — 2.

Заявы і дакументы згодна палажэнню аб конкурсах накіроўваць на імя рэктара па адрасе: г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 30.

Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання.

Даведкі па тэлефоне — 22-49-42, 22-14-03, 22-96-71.

Галоўны рэдактар Л. Я. ПРОКША.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, А. С. ГРАЧАНІКАЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі—3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-24-62 аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі—6-25-87.

«Литература и искусство»—орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 АТ 19023